Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

1 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №145 (28509)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Прапановы турсезона**

СТАР. 6



**Вяртаючы былую славу**

СТАР. 9



**Дзевяць кветак і крынічная вада**

СТАР. 13

# Раніца. Туман. Нёман



Пасля нядаўняга ліўня рака Нёман каля вёскі Касцяшы Уздзенскага раёна выйшла з берагоў, затапіла пойменныя лугі. І мясцоваму конюху Андрэю КІМУ даводзіцца пераадольваць водныя перашкоды, пераганяючы свой табун на новую пашу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«У цэлым краіна ўступіла ва ўборачную кампанію дастаткова арганізавана. Сельскагаспадарчым работам папярэднічала падрыхтоўка, у тым ліку з боку праваахоўнікаў. Але такі важны для аграрыяў этап не абыходзіцца без праблем. Так, фіксуюцца выпадкі безгаспадарлівасці, якія становяцца прычынай псавання тэхнікі, страты часткі ўраджаю. Вінаватыя панясуць за гэта адказнасць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9442 | ▲ |
| Еўра | 2,2816 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0752 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Еўрагульні. Чакаем разам

## Звярок, цацка ці чалавек?

### Хто будзе ўвасабляць Еўрапейскія гульні ў Мінску?

**Здаецца, яшчэ нядаўна наша краіна атрымала права на правядзенне гэтага вялікага спартыўнага турніру, а сёння падрыхтоўка да яго ідзе ўжо поўным ходам. Распрацаваны лагатып, прадумваецца праграма спаборніцтваў, набіраюцца валанцёры і... аб'яўлены конкурс на стварэнне талісмана Еўрагульняў, у якім можа прыняць удзел любы ахвотны. Для гэтага трэба прыдумаць ідэю талісмана, яго малюнак і імя. Заяўкі прымаюцца да 15 лістапада 2017 года (на электронную пошту info@mininform.gov.by, у тэме ліста неабходна пазначыць «Конкурс»). Уладальнікі першых трох прызавых месцаў атрымаюць запрашальныя білеты на мерапрыемствы ІІ Еўрапейскіх гульняў, а таксама камплекты парадна-спартыўнай экіпіроўкі беларускай зборнай.**

СТАР. 8

## МЕДЫЯДЖУНГЛІ: правілы выжывання,

### або Як не трапіць у інфармацыйную пастку

**Усяго некалькі дзясяткаў гадоў таму паток медыяінфармацыі быў абмежаваны трыма-чатырма тэлеканаламі, цэнтральнымі газетамі і некалькімі часопісамі. А сёння ўсе мы знаходзімся ў медыяпалоне амаль круглыя суткі. Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, рэклама, камерцыйныя аб'явы, тэленавіны, кінафільмы, музыка, мноства радыёстанцый... Аўтаматычныя сэрвісы падказваюць нам, што купіць і дзе, у якую турфірму звярнуцца, з кім пазнаёміцца, што пачытаць... Медыя інтэграваныя ў наша жыццё настолькі, што большасць паведамленняў мы атрымліваем у фонавым рэжыме, не звяртаючы на іх увагі.**

СТАР. 4–5




Фота Надзеі БУЖАН.

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 8 дзён

**На ўсе 100!!!**

**100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна. Заставайцеся з намі – будзе цікава! Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.**

# ГАРАНТЫЯ ДАВЕРУ

**Мірныя сустрэчы вайскоўцаў на трэніровачных пляцоўках — найлепшы доказ даверу паміж дзяржавамі і іх узброенымі сіламі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Аляксандр Лукашэнка заявіў у прывітанні арганізатарам, удзельнікам і гасцям армейскіх міжнародных гульняў «АрМІ-2017». Вітальнае слова Прэзідэнта, як паведамляе БЕЛТА, транслiравалася ў суботу падчас урачыстага адкрыцця спаборніцтваў у Падмаскоўі.**

«Вітаю вас і віншую з пачаткам традыцыйных спаборніцтваў, якія ўжо атрымалі неафармальную назву Ваеннай алімпіяды. У такім саперніцтве заключаны глыбокі сэнс. Бо, пагадзіцеся, больш звыкла бачыць людзей са зброяй у руках на магутнай ваеннай тэхніцы на полі бою. Таму мірныя сустрэчы вайскоўцаў на трэніровачных пляцоўках — найлепшы доказ даверу паміж дзяржавамі і іх узброенымі сіламі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння, дадаў ён, гэта асабліва актуальна. «У свеце неспакойна. Міжнародны тэрарызм пагражае ўсім без выключэння дзяржавам. На жаль, і агульная абстаноўка ў сусветнай супольнасці вызначаецца напружанасцю. Таму ўсім міралюбным сілам трэба быць асабліва пільнымі, сабранымі і гатовымі да рэагавання на самыя нечаканыя выклікі і пагрозы», — заявіў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, выдатная боегатоўнасць, вывучка і асншчанасць узброеных сіл, паразуменне і ваеннае братэрства саюзнікаў і партнёраў з'яўляюцца самай надзейнай гарантыяй бяспекі краін. «Вайсковыя гульні сабралі разам ваеннаслужачых з многіх дзяржаў. Гэта найлепшыя з найлепшых, хто па праву лічыцца элітай узброеных сіл. Кожны з вас прайшоў нялёгкі шлях адбору, вытрымаў сапраўды сур'ёзныя выпрабаванні. Як і ў спорце, менавіта дзякуючы сіле духу, выдатнай падрыхтоўцы і мэтанакіраванасці вы сёння тут. Вам выпаў высокі гонар прадстаўляць сваю краіну на міжнародных спаборніцтвах, дэманстраваць баявую вывучку, тактычнае майстэрства, уменне дзейнічаць выразна і зладжана. Ва ўсіх сферах цэніцца прафесійнае мастэрства. Але асабліва неабходна гэта якасць у высакароднай справе абароны Айчыны», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што гульні паслужаць для вайскоўцаў добрай школай, дадуць магчымасць абмяняцца практычным вопытам і ваеннымі ведамі. «А ў злоснікаў надоўга адаб'е жаданне разглядаць нас праз зброевы прыцэл. Няхай і надалей воіны нашых армій сустракаюцца менавіта на падобных спаборніцтвах, а іх геаграфія максімальна пашыраецца, далучаючы новыя краіны і кантыненты. Падобныя мерапрыемствы служаць вялікай мэце — падтрыманню міру і бяспекі», — сказаў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы пажадаў усім удзельнікам армейскіх міжнародных гульняў поспехаў і высокіх вынікаў у спаборніцтвах, а роднай беларускай камандзе — яркіх і пераканаўчых перамог.

## «Воін Садружнасці» — зноў у Беларусі

**У Мінску стартаваў міжнародны конкурс ваеннапрафесійнага майстэрства «Воін Садружнасці — 2017» сярод салдатаў, матросаў, сяржантаў і старшынь, якія служаць па кантракце ва ўзброеных сілах дзяржаў — удзельніц СНД. Урачыстая цырымонія адкрыцця адбылася днямі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

На працягу тыдня вайскоўцы з Арменіі, Беларусі, Казахстана і Расійскай Федэрацыі паспаборнічаюць у спартыўным конкурсе «Атлет», ваенна-прафесійных выпрабаваннях «Прафесіянал» і «Снайпер». Свае інтэлектуальныя здольнасці каманды ўжо прадэманстравалі падчас конкурсу «Эрудыт», а наколькі людзі ў пагонах сябруюць з творчасцю, неўзабаве прафесійнае журы ацэніць як падчас этапу «Кавалер» («Спадарыня»).

Як адзначыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ,** сёлета конкурс уключаны ў праграму «Армейскіх міжнародных гульняў — 2017», якія таксама ў суботу стартавалі пад Масквой. «Адна з асноўных мэт конкурсу «Воін Садружнасці» — развіццё і ўмацаванне сяброўскіх сувязяў паміж ваеннаслужачымі ўзброеных сіл дзяржаў — удзельніц СНД», — падкрэсліў Алег Белаконеў.

# КАЛІ ПАМІРАЕ ЛЕГЕНДА...



Фота БЕЛТА.

**Уладзімір Бядуля, кіраўнік сельскагаспадарча-вытворчага кааператыва «Савецкая Беларусь», двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік культуры БССР, пайшоў з жыцця. Сёлета яму споўнілася 90 гадоў.**

«Звязда» неаднойчы пісала пра гэтага таленавітага чалавека. Сваю працу ў калгасе ён пачаў у 1955 годзе. Быў такі партыйны заклік: узначаліць адсталыя гаспадаркі і вывесці іх на перадавыя рубяжы. Уладзімір Бядуля падаў заяву, потым прайшоў трохтыднёвыя курсы ў Пінску. А праз паўгода ўжо стаў кіраўніком самага слабага калгаса Камянецкага раёна — «Савецкай Беларусі». У 2006-м, на святкаванне 50-годдзя прафесійнай дзейнасці, атрымаў званне ганаровага старшыні.

Дзякуючы адданасці сваёй працы, пільнаму стаўленню да людзей Уладзімір Бядуля заслужыў аўтарытэт і павагу сярод сваіх землякоў. За час кар'еры ён абіраўся народным дэпутатам СССР, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Заслугі Уладзіміра Бядулі перад Айчынай ацэнены годна: двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэнаў Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», Айчыны III ступені, а таксама ордэна Францыска Скарыны... У горадзе Камянец Указам Прэзідэнта быў установлены бронзавы бюст Уладзіміра Бядулі.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні родным і блізкім двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Уладзіміра Бядулі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што адыход з жыцця Уладзіміра Бядулі — незаменная страта для краіны. «Такія людзі, як ён, з'яўляюцца ўвасабленнем цэлай эпохі ў гісторыі Беларусі. Гэта быў паважаны народны дэпутат, яркі, таленавіты кіраўнік, які змог укараніць перадавыя метады вядзення сельскай гаспадаркі. Дзякуючы наватарскаму мысленню, вялікай энергіі і ўменню працаваць з людзьмі даручаная яму гаспадарка праславілася не толькі на Радзіме, але і далёка за яе межамі. Нашы аграрыі і сённа вучацца на бясцэнным вопыце гэтага працавітага, сумленнага, адданага справе чалавека», — гаворыцца ў спачуванні.**

## ■ Меркаванне



# Адыход ад ілюзій

## Знешняя палітыка Расіі — узмацненне жорсткасці курсу

Эліты Расіі канчаткова страцілі надзею на тое, што з прыходам Трампа ўдасца разруліць спрэчныя пытанні ў адносінах з ЗША і заняцца стабілізацыяй эканамічнага і палітычнага курсу на іншых кірунках. Як і асцерагаліся многія, зоркі сышліся неспрыяльна для новага амерыканскага прэзідэнта. Пачнём з таго, што Дональд Трамп аказаўся вельмі неспрактыкаваным палітыкам, і яго не прыняў вашынгтонскі істэблішмент. Экстравагантнасць і парушэнні табу, якія прынеслі яму галасы выбаршчыкаў, ні ў якім разе не маглі быць прыняты як мова зносінаў з грандамі амерыканскай палітыкі, якія за многія дзесяцігоддзі знаходжання ва ўладзе даўно выпрацавалі ўласны кодэкс паводзін, якога Трамп не ўмее прытрымлівацца.

Далей Трамп стаў ахвярай новага трэнду ў амерыканскай дэмаграфіі — з кожным годам у ЗША расце колькасць выбаршчыкаў, схільных да падтрымкі дэмакратычных кандыдатаў, і падае колькасць рэспубліканскага электарату. Па нараджальнасці белыя здалі пазіцыі яшчэ ў 2012 годзе, і цяпер большасць немаўлят ужо адносіцца да іншых рас.

Для дэмакратычнага электарату Трамп непрымальны. Па-першае, гэта мільярдэр, што зняважліва для людзей, якім часта даволі цяжка зарабіць на жыццё, не кажучы ўжо пра нейкія празмернасці. Па-другое, з-за ўзросту ён вельмі кансерватыўны ў сваіх выказваннях і палітычных перавагах, у выніку часта абражае выбаршчыкаў, якія не належаць да белай расы.

Наступная праблема Трампа заключаецца ў яго сварцы з ЛГБТ — лесбіянкамі, геямі, бісексуаламі і трансгендарамі. Нягледзячы на некаторыя рэверансы перад імі падчас выбарчай кампаніі, прадстаўнікі ЛГБТ цудоўна разумеюць, што яны пажылому Трампу не даспадобы. І свежая забарона служыць трансгендарам у амерыканскай арміі гэта выдатна пацвердзіла. А яны ў ЗША вельмі ўплывовыя, асабліва ў сферы СМІ.

Гэтыя і іншыя фактары прыводзяць да сітуацыі, калі праз паўгода пасля ўступлення на пасаду Трамп стаў прэзідэнтам, які мае вельмі мала ўплыву на палітычныя працэсы. Кангрэс, у якім дамінуе яго ўласная партыя, яму не даверае і не ўхваляе яго ініцыятывы. Падтрымка сярод электарату мінімальная ў параўнанні з любым іншым прэзідэнтам за некалькі дзесяцігоддзяў. І заклікі Трампа палепшыць адносіны з Расіяй, якія гучалі падчас выбарчай кампаніі, на практыцы немагчыма рэалізаваць, паколькі ў яго звязаныя рукі.

Усвядоміўшы, што гэта новая рэальнасць амерыканскай палітыкі, Уладзімір Пуцін прыступіў да крокаў, якія падкрэсліваюць знікненне ў яго ўсялякіх ілюзій на перазагрузку адносін пры новым прэзідэнце ЗША. Як вядома, напярэдадні новага года ЗША ўвялі супраць Расіі новыя санкцыі і выслалі тры дзясяткі дыпламатаў, абвясціўшы іх скрытымі разведчыкамі, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць пад прыкрыццём дыпламатычнага статусу. Таксама расійская дыпмісія страціла права карыстацца сваімі комплексамі для адпачынку на тэрыторыі ЗША. Тады адказ Расіі быў асіметрычны, паколькі рашэнне прымалася яшчэ адміністрацыяй Абамы. Уладзімір Пуцін даслаў амерыканскім дыпламатам пуцёўкі для адпачынку ў Сочы, каб прадэманстраваць, што несур'ёзна ставіцца да такога кроку з боку адыходзячага прэзідэнта.

Цяпер усё змянілася. 28 ліпеня МЗС Расіі прапанаваў да 1 верасня скараціць да 455 чалавек агульную колькасць персаналу, занятага ў дыпмісіях Злучаных Штатаў на расійскай тэрыторыі, што будзе эквівалентна колькасці дыпламатаў, якія прысутнічаюць ад Расіі на тэрыторыі ЗША. Акрамя гэтага, з 1 жніўня супрацоўнікам амерыканскага пасольства ў Маскве будзе забаронена карыстацца дачай у Сярэбраным Бары, а таксама складскімі памяшканнямі ў расійскай сталіцы. Здавалася б, усё дастаткова сіметрычна мерам ЗША супраць Расіі ў мінулым снежні. Але па факце персанал дыпмісій ЗША скароціцца не на 30 чалавек, як было зроблена ў дачыненні да Расіі, а на 755 чалавек, паколькі амерыканцы мелі нашмат больш масіўную прысутнасць у Расіі, чым яна ў ЗША. Дзяржпэп ужо выказаў сваё шкадаванне з гэтай нагоды, але ўдар для амерыканцаў будзе вельмі адчувальны. Усе гэтыя сотні дыпламатаў былі ў Расіі не выпадкова, а ажыццяўлялі важныя функцыі па заваёўванні падтрымкі сярод расійскага грамадства, зборы інфармацыі аб развіцці краіны. Зараз усю гэтую сістэму давядзецца вельмі сур'ёзна перакройваць, каб яна магла выконваць ранейшыя функцыі ў новым усечаным выглядзе. І такі крок з боку Расіі сведчыць аб яе рашучасці ісці ў адносінах з ЗША на прынцып.

Дадатковай навіной ад Масквы, якая сведчыць аб яе гатоўнасці жорстка канфліктаваць з ЗША не толькі ў найбліжэйшыя гады, але пры неабходнасці і дзесяцігоддзі, сведчыць даручэнне Пуціна стварыць другі па магутнасці ваенны флот у свеце і выступленне па тэлебачанні першага намесніка старшыні камітэта Савета Федэрацыі па абароне і бяспецы Франца Клінцэвіча, у якім ён расказаў пра намер закласці шэсць новых авіяносцаў у найбліжэйшыя гады.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Лондан можа губляць да мільярда фунтаў у год з-за новых мытных правілаў



Новыя правілы мытнага нагляду на межах Вялікабрытаніі пасля брэкзіту могуць прывесці да затрымак дастаўкі грузаў, шкода ад якіх складзе не менш за мільярд фунтаў у год, сведчаць дадзеныя справаздачы еўрапейскага даследчага цэнтра Oxera. Кіраўнік транспартнага дэпартамента цэнтра Эндру Міней заўважае, што гэтыя ацэнкі можна лічыць «сціплымі», паколькі ў пазначаную суму не ўваходзяць многія спадарожныя выдаткі, у тым ліку выдаткі на стварэнне новых кантрольных пунктаў і аплата працы новых супрацоўнікаў. Газета Guardian называе такі сцэнарый «найбольш імаверным» і адзначае, што члены Кансерватыўнай партыі ўжо выказвалі асцярогу адносна магчымага павелічэння чэргаў на межах.

### Forbes назваў самых высокааплатных расійскіх музыкантаў

Расійская оперная спявачка Ганна Нятрэбка ўзначаліла рэйтынг самых высокааплатных расійскіх музыкантаў паводле версіі часопіса Forbes, зарабіўшы за год 7,5 мільёна долараў. На другім месцы ў 2017 годзе апынуўся эстрадны спявак Філіп Кіркораў, які зарабіў 7,4 мільёна долараў, на трэцім — рэп-выканаўца Цімаці з прыбыткам у 6,6 мільёна долараў. Таксама ў дзясятку трапілі Дзіма Білан, Рыгор Лепс, гурт «Би-2», Сяргей Шнураў, Земфіра, Мікалай Баскаў і Ягор Крыд.

### У Сьера-Леонэ забаранілі бегаць па вуліцах

Улады Сьера-Леонэ забаранілі бегаць трушком па вуліцах гарадоў, паведамляе тэлеканал Africanews.

Падобныя абмежаванні растлумачылі нязручнасцямі, якія ствараюць бегуны. Як заявілі ў паліцыі, яны абражаюць прахожых і крадуць у іх рэчы, перашкаджаюць дарожнаму руху, стукаюць па аўтамабілях і гучна ўключаюць музыку на сваіх прыладах. З гэтага часу ў Сьера-Леонэ прыйдзецца атрымліваць спецыяльны дазвол на бег па вуліцах. Мясцовыя сілавікі не ўдакладняюць, што пагражае парушальнікам. Разам з тым любы ахвотны па-ранейшаму зможа займацца бегам на пляжах ці ў адмысловых спартыўных зонах.

### Памерла Жанна Маро



У Парыжы памерла французская актрыса Жанна Маро, паведамляе Closer. Цела артысткі знайшла ў яе кватэры хатняя прыслужніца, інфармацыю пра смерць пацвердзіў яе агент.

Маро было 89 гадоў. Актрыса найбольш вядомая па стужках рэжысёраў «новай хвалі» Франсуа Труфо і Луі Маля, а таксама кінематаграфістаў Мікеланджэла Антаніёні і Луіса Бунюэля. Яна сыграла ў такіх фільмах, як «Ева», «Жуль і Джым», «Ноч», «Дзённік пакаёўкі» і «Нявеста была ў чорным». Апошняя карціна з удзелам Маро, «Талент маіх сяброў», выйшла ў 2015 годзе. Жанна Маро стала лаўрэатам ганаровай «Залатой пальмавай галіны» Канскага кінафестывалю, а таксама «Залатога льва» Венецыянскага кінаагляду за ўклад у развіццё кіно і «Залатога мядзведзя» Берлінскага кінафестывалю.

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, двойчы Героя Сацыялістычнай працы БЯДУЛІ Уладзіміра Лявонцьевіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

■ На слыху

# ШТО ЗМЕНІЦЦА З 1 ЖНІЎНЯ

**У сувязі са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму (нагадаем, з 1 жніўня БПМ устаноўлены ў памеры 197,57 беларускага рубля ў сярэднім на душу насельніцтва) зменіцца памер цэлага шэрагу выплат і дапамог.**

### Павялічацца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі і некаторыя надбаўкі

Гэта датычыцца надбавак, павышэнняў да пенсій і даплат асобам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а таксама дапамог па доглядзе інваліда І групы або чалавека, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту.

✓ Мінімальная пенсія па ўзросце з улікам даплаты ў памеры 20% ад сярэдняй зарплаты складзе 174,61 руб.

✓ Сацыяльная пенсія інвалідам 1-й групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства, — 217,33 руб.

✓ Сацыяльная пенсія інвалідам з дзяцінства 2-й групы — 187,69 руб.

✓ Сацыяльная пенсія інвалідам 2-й групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства), дзецям у выпадку страты карміцеля — 167,94 руб.

✓ Сацыяльная пенсія інвалідам 3-й групы — 148,18 руб.

✓ Сацыяльная пенсія дзецям-інвалідам да 18 гадоў пры першай ступені страты здароўя складзе 158,06 руб., пры другой ступені страты здароўя — 167,94 руб., трэцяй ступені — 187,69 руб., чацвёртай — 217,33 руб.

✓ Даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі 75 гадоў, — 37,04 руб., 80 гадоў — 49,39 руб.

### Павялічыцца дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў

У сувязі з ростам за 2-і квартал гэтага года сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне (па даных Белстата, яна склала 796,80 руб.) павялічваюцца памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

✓ Дапамога па доглядзе першага дзіцяці будзе раўняцца 278,88 руб. (35% сярэднямесячнай заработнай платы).




✓ Дапамога па доглядзе другога і наступных дзяцей складзе 318,72 руб. (40% сярэднямесячнай заработнай платы).

✓ Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда — 358,56 руб. (45% сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад чарговасці нараджэння гэтага дзіцяці ў сям'і).

Нагадаем, што ў чэрвені ў Беларусі змяніўся парадак перагляду выплаты дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Цяпер пералік будзе праводзіцца двойчы на год: з 1 лютага і з 1 жніўня, а не раз на квартал, як раней.

### Павялічацца некаторыя іншыя дзіцячыя дапамогі

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 жніўня таксама зменіцца памер аднаразовых выплат у сувязі з нараджэннем дзіцяці. Ён залежыць ад бюджэту пражытковага мінімуму.

Аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці складзе 1975,7 руб. (10 БПМ), другога і наступных дзяцей — 2765,98 руб. (14 БПМ); па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — 197,57 руб. (1 БПМ); на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — 98,78 руб. (0,5 БПМ); на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека, — 138 руб. (0,7 БПМ).

### Зменяцца мінімальныя спажывецкія бюджэты

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года БПМ працаздольнага насельніцтва складзе 218,87 руб.; пенсіянераў — 151,98 руб.; студэнтаў — 192,79 руб.; дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 125,87 руб.; дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 174,9 руб.; дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 215,5 руб.

Пражытковы мінімум для асноўных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва складаецца з мінімальных набораў прадуктаў харчавання і нехарчовых тавараў і паслуг (іх кошт вызначаны ў памеры 77% ад кошту мінімальнага набору прадуктаў харчавання).

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Слупок тэрмометра пераваліць за 30



**На гэтым тыдні ў Беларусь прыйдзе моцная спёка, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Умовы надвор'я ў краіне будуць вызначаць цёплыя паветраныя масы, што рухаюцца з поўдня Еўропы. Ужо сёння ў краіне з-за спёкі аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі. У дзённыя гадзіны на поўдні краіны паветра прагрэецца да 30—34 градусаў, у сераду такая самая спёка прыйдзе і на астатнюю частку краіны. У сераду ў асобных раёнах слупок тэрмометра пакажа 35—36 цяпла.**

Сёння ў асобных раёнах, пераважна па паўднёвым захадзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Днём ападкі не прагназуюцца. Ноччу тэмпература паветра складзе 15—21 градус, удзень 24—29, а па поўдні 30—34.

Заўтра ноччу па поўначы, а ўдзень у асобных раёнах па паўночным захадзе таксама пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Днём месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру да 15—20 метраў за секунду. Ноччу будзе 16—23 цяпла, днём — 27—34, у асобных раёнах па поўдні — 35—36 градусаў.

У чацвер у асобных раёнах Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Уначы слупок тэрмометра будзе паказваць 14—20 градусаў, удзень — 22—29. Па паўднёвым усходзе ноччу чакаецца 21—22 градусы, удзень — 30—31.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у канцы тыдня ў Беларусь прыйдзе непагадзь. Ужо ў пятніцу надвор'е будуць фарміраваць атмасферныя франты з Заходняй Еўропы, якія прынясуць з сабой моцныя дажджы і навальніцы, а ў асобныя раёны — град і вецер хуткасцю 15—20 метраў за секунду.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# Канфлікт у спёку ў бары з-за халоднай шаўрмы

**Адразу некалькі канфліктаў у піцейных установах былі зарэгістраваны ў Цэнтральным раёне Мінска, калі на іх выязджалі праваахоўнікі.**

Напачатку ў дзяжурную частку Цэнтральнага РУУС сталіцы паступіла паведамленне пра канфлікт кліента з адміністрацыяй аднаго з бараў на вуліцы Зыбіцкай. Міліцыянерам мужчына растлумачыў, што разлаваўся з-за няякаснага абслугоўвання, бо набытая ім шаўрма была халоднай. Пасля гутаркі супрацоўнікаў міліцыі з кліентам і адміністрацыяй канфлікт быў уладжаны.

Праз некалькі гадзін паступіла паведамленне пра тое, што п'яны наведвальнік аднаго з бараў па праспекце Пераможцаў прыстае да работнікаў і наведвальнікаў, правакуе і кідаецца ў бойку. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі 24-гадовага мінчаніна і даставілі ў РУУС, дзе ў дачыненні да яго складзены адміністрацыйны пратакол за дробнае хуліганства.

Яшчэ двое наведвальнікаў сталічнага бара на Кастрычніцкай плошчы не былі згодныя з выстаўленым рахункам і адмаўляліся пакідаць установу. Пасля прыбыцця супрацоўнікаў міліцыі канфлікт быў уладжаны.

Як адзначыла **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ**, за дробнае хуліганства прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 17.1. КоАП Рэспублікі Беларусь, а за непрад'яўленне па першым патрабаванні грамадзяніна кнігі заўваг і прапаноў адміністрацыйная адказнасць прадугледжана згодна з артыкулам 9.24 КоАП Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Асаблівая ўвага

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 2 жніўня правядзе рэспубліканскую селектарную нараду па пытаннях уборкі ўраджаю ў 2017 годзе, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Асаблівая ўвага да цяперашняй уборачнай кампаніі выклікана тым, што на яе аказваюць уплыў неўстойлівыя ўмовы надвор'я. Таму кантроль за правядзеннем палявых работ, вынік якіх уплывае на стан эканамічнай і харчовай бяспекі дзяржавы, вядзецца на вышэйшым узроўні.

На селектарнай нарадзе плануецца падрабязна абмеркаваць ход уборачнай кампаніі, у тым ліку падыходы па забеспячэнні максімальнай захаванасці ўраджаю, пытанні рэсурснага і тэхнічнага аснашчэння сельгасарганізацый. Пра стан спраў далажаць кіраўнікі рэгіёнаў, якія падчас правядзення мерапрыемства будуць знаходзіцца на прамой сувязі.

# БІТВА ЗА ЗБОЖЖА

**Беларускія аграрыі распачалі масавую ўборку ўраджаю. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у краіне да 31 ліпеня сабрана 646,7 тысячы тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці ў 32,4 ц/га. Усяго збожжавыя і зернебабовыя прыбраны з 8,84% пасяўных плошчаў.**

Лідзіруе Брэсцкая вобласць, дзе намалот збожжа склаў 282,4 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці 35,2 ц/га. Ураджай там убралі з 23,9% плошчаў. На другім месцы Гомельская вобласць з вынікам у 237,4 тысячы тон і ўраджайнасцю 27,8 ц/га, на трэцім — Гродзенская — з паказчыкам 61,2 тысячы тон збожжа і самай высокай ураджайнасцю па краіне ў 43 ц/га. Далей па спісе ідуць Мінская вобласць з намалотам у 58,8 тысячы тон, Магілёўская і Віцебская вобласці з вынікам у 6,78 і 0,2 тысячы тон адпаведна.

Масавая ўборка ў некаторых раёнах краіны ператвараецца ў бітву за ўраджай. Кантынгент Узброеных Сіл краіны з 25 ліпеня прыступіў да работ у 14 сельскагаспадарчых арганізацыях у Мінскім, Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці, Мсціслаўскім, Асіповіцкім раёнах Магілёўскай вобласці. Створана і аператыўная група для кіравання вайскоўцамі і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады. Са складу салдат і грамадзянскага персаналу злучэнняў і вайсковых часцей УС сфарміраваны зводныя аўтамабільныя ўзводы 30-й асобнай чыгуначнай брыгады дэпартамента транспартнага забеспячэння Мінабароны і 15-й зенітнай ракетнай брыгады Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. Для перавозкі сельскагаспадарчых грузаў задзейнічана больш за 80 вайскоўцаў і грамадзянскага персаналу і звыш 50 адзінак аўтамабільнай тэхнікі.

Нагадаем, што тэхнічная забяспечанасць сельгасарганізацый дазваляе правесці работы па ўборцы збожжавых і зернебабовых культур у аптымальныя агратэхнічныя тэрміны. Таксама, паводле папярэдніх ацэнак навукоўцаў, ураджай збожжа ў бягучым годзе павінен вырасці на 20% у параўнанні з мінулым годам — у краіне плануецца сабраць 7,2 мільёна тон збожжавых і зернебабовых (без кукурузы ў свірнавай вазе пасля дапрацоўкі).

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*




■ Рэйтынгі

# Fitch Ratings пералічыла прагноз для Беларусі

**Эксперты агенцтва змянілі прагноз доўгатэрміновых рэйтынгаў дэфолту эмітэнта ў замежнай і нацыянальнай валюце са стабільнага да пазітыўнага і пацвердзілі іх на ўзроўні «В».**

Кароткатэрміновы рэйтынгі ў замежнай і нацыянальнай валюце пацверджаны на ўзроўні «В», а краінавы паталок — на ўзроўні «В-». Рэйтынг, які быў прысвоены ў канцы чэрвеня беларускім еўрааблігацыям, застаецца на ўзроўні «В-». Сярод пазітыўных фактараў агенцтва назвала паляпшэнне доступу нашай краіны да знешняга фінансавання і павелічэнне міжнародных рэзерваў. Акрамя таго, Fitch адзначае станоўчы ўплыў на эканоміку дасягнення дамоўленасці з Расіяй па цэнах на газ. Fitch Ratings Inc. — амерыканская карпарацыя, якая ўваходзіць у «вялікую тройку» міжнародных рэйтынгавых агенцтваў нароўні са Standard & Poor's і Moody's.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# МЕДЫЯДЖУНГЛІ:

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Але інфармацыя самага рознага кшталту не проста льецца патокам, а ненадакучліва вучыць маладое пакаленне, выхоўвае яго, пакідаючы далёка ззаду бацькоў і педагогаў з іх патрабаваннямі, муштраваннем і маралізатарствам. Сёння казаць пра ўплыў інтэрнэту на дзяцей і падлеткаў у прынцыпе няправільна, бо ён стаў для іх жыццёвым асяроддзем. І калі раней пры вяртанні дзяцей са школы бацькі ў іх пыталіся: «Як прайшоў дзень у школе?», то цяпер трэба цікавіцца: «Як прайшоў дзень у інтэрнэце?» Межы паміж віртуальным і рэальным жыццём пастуова сціраюцца...

Як жа абараніць падрастаючае пакаленне ад непраўдзівай і негатыўнай інфармацыі, якая распаўсюджваецца ў інтэрнэце з хуткасцю святла? Як выхаваць адукаваную асобу, здольную арыентавацца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы? Ці можна «пасябраваць» з медыя? Усе гэтыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі круглага стала ў газеце «Звязда». Да дыскусіі мы запрасілі **начальніка Цэнтра прафесійнага развіцця і інавацыйнай адукацыі Алену РАДЗЕВІЧ, метадыста аддзела сацыякультурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Алену ПАЛЕЙКУ, метадыста Цэнтра праблем развіцця адукацыі БДУ Дзмітрыя ГУБАРЭВІЧА, дацэнта кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ Міхаіла КУДЗЕЙКУ, намесніка старшыні Таварыства беларускай школы, кіраўніка інтэрнэт-партала nastaunik.info Тамару МАЦКЕВІЧ, настаўніка фізікі жодзінскай гімназіі №1 Элу ЯКУБОЎСКУЮ, настаўніка англійскай мовы з Нясвіжскай гімназіі Наталлю КАТЧАНКУ і дырэктара сярэдняй школы №2 г. Століна, настаўніцу рускай мовы і літаратуры Алу ЛАЗІЦКУЮ (усе трое маюць найвышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст»).**

## ФІЛЬТРЫ ДЛЯ МЕДЫЯ

**«ЗВЯЗДА»:** ***Перш чым распачаць дыскусію, хацелася б разабрацца з паняццямі «медыяадукацыя», «медыяадукаванасць» і «крытычнае мысленне»...***

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Медыяадукацыя — гэта працэс навучання тэорыі і авалодвання практычнымі ўменнямі для аналізу і выкарыстання сучасных масмедыя. А медыяадукаванасць — вынік гэтага працэсу і ўвогуле ключавы навык XXI стагоддзя. Сёння традыцыйнай адукаванасці вучню недастаткова, каб арыентавацца ў падзеях і быць канкурэнтаздольным на рынку працы, таму кожны вучань павінен развіваць навыкі мыслення больш высокага ўзроўню. Раней інфармацыю трэба было здабываць, і гэтаму дапамагала школа, а сёння інфармацыі занадта шмат, таму задача школы — навучыць адфільтроўваць патрэбнае, не дапускаць маніпулявання, адрозніваць факты ад меркаванняў, праўду ад дапушчэнняў. У гэтым дапамагае крытычнае мысленне.

Чалавек з развітым крытычным мысленнем успрымае інфармацыю з разумнай доляй скептыцызму, супастаўляе з процілеглымі пунктамі гледжання і разглядае яе магчымыя наступствы. **Крытычнае мысленне не можа развіцца ў выніку перадачы парад, рэцэптаў, выканння пэўнага алгарытму. Гэта складаны разумовы працэс...** З крытычным мысленнем цесна звязаны шэраг уменняў і навыкаў: гэта ўменне задаваць пытанні, фармуляваць праблему, даказваць свой пункт гледжання, аналізаваць здагадкі і прадузятасці, уменне пазбягаць эмацыянальных меркаванняў і спрашчэнняў, разглядаць усе наяўныя інтэрпрэтацыі і іншыя.

**Алена ПАЛЕЙКА:**

— На сённяшні дзень у нашых вучэбных праграмах медыяінфармацыйныя кампетэнцыі вучняў вызначаны разам з іншымі ключавымі кампетэнцыямі як запланаваныя метапрадметныя вынікі адукацыі. Напрыклад, вось як сфармуляваны агульныя патрабаванні да старшакласнікаў: умець атрымліваць з разнастайных крыніц і крытычна асэнсоўваць інфармацыю, сістэматызаваць, аналізаваць, інтэрпрэтаваць атрыманыя даныя; адрозніваць факты, аргументы, ацэначныя меркаванні, аддзяляць асноўную інфармацыю ад другараднай, перадаваць змест інфармацыі адэкватна пастаўленай мэце (сцісла, поўна, выбарачна); выкарыстоўваць сродкі інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій з захаваннем прававых і этычных нормаў, нормаў інфармацыйнай бяспекі.


Фота Надзеі БУЖАН.
Алена РАДЗЕВІЧ.


Алена ПАЛЕЙКА.


Дзмітрый ГУБАРЭВІЧ.


Міхаіл КУДЗЕЙКА.

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Пытанне, якое я заўсёды задаю настаўнікам, што ўдзельнічаюць у трэнінгах і семінарах па крытычным мысленні: «А ці хочаце вы, каб у вашым класе былі вучні з крытычным мысленнем? Ці зручна вам будзе з імі працаваць?» І яны задумваюцца, бо такія вучні задаюць шмат пытанняў, з доляй скептыцызму ставяцца да любой пачутай на ўроку інфармацыі. У нейкай ступені ад гэтага церпіць і аўтарытэт настаўніка. У інтэрнэце вельмі шмат інфармацыі, якая можа супярэчыць таму, што кажа на ўроку педагог.

Я лічу, што медыяадукаванасць — гэта не прадмет, які можа выкладацца ў школе. У першую чаргу медыяадукаваным павінен быць настаўнік, у яго павінна быць добра развіта крытычнае мысленне, каб ужо ён у сваю чаргу мог развіваць крытычнае мысленне ў сваіх вучняў.

**Міхаіл КУДЗЕЙКА:**

— Крытычнае мысленне развіваецца, калі мы даём дзіцяці свабоду, даём яму магчымасць выказаць свой пункт гледжання, знайсці альтэрнатыўнае рашэнне. Але нашы настаўнікі першапачаткова накіраваныя на нейкі пэўны вынік. Настаўнік сказаў — вучань зрабіў, настаўнік прынёс веды — вучань іх узяў. А трэба вучыць таму, каб дзіця на аснове атрыманай інфармацыі сфарміравала сваё меркаванне, зрабіла сваю выснову, а не далучалася да высновы настаўніка.

**Дзмітрый ГУБАРЭВІЧ:**

— У мяне ёсць вялікае сумненне, што вынікам працэсу развіцця крытычнага мыслення можа быць толькі фарміраванне ўласнай пазіцыі. А што стаіць за гэтай пазіцыяй? Акрамя таго, што студэнт ці вучань менавіта так думае, ці ёсць там нейкі змест, ці ёсць аргументы? Крытычнае мысленне павінна базіравацца на добрым веданні прадмета гаворкі, бо калі ты не можаш даць змястоўную ацэнку нейкай з'яве, падзеі ці феномену, калі ты не маеш дакладнага разумення, пра што ідзе гаворка, пра якую ўласную пазіцыю можа ісці размова?

Крытычнае мысленне не ёсць проста крытычнае адмаўленне нейкай інфармацыі, як некаторыя памылкова думаюць. І медыяадукаванасць — гэта не толькі крытычнае мысленне. Крытычнае мысленне — праект, які цудоўна існуе і без медыяадукаванасці. А вось медыяадукаванасць без крытычнага мыслення немагчымая.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Ад сённяшняга спажыўца навін патрабуецца ўменне не толькі чытаць, але і аналізаваць іх, наяўнасць своеасаблівага ўнутранага фільтра, які дазваляе рабіць правільныя высновы наконт надзейнасці крыніцы інфармацыі. Усе СМІ працуюць на камерцыйнай арэне. Прычым даволі часта як крывое люстэрка. Але задача медыяадукацыі — не выпраўленне карцінкі, а разуменне таго, як працуе крывое люстэрка. Вельмі важна, каб чалавек мог распазнаць камерцыйныя пасылы, якія яму пастаянна навязваюцца. Навучэнцы павінны ведаць, што сацыяльныя сеткі поўняцца дэзынфармацыяй, прапануюць нам тэсты і віктарыны, каб даведацца пра нас больш. Мы часта думаем, што выкарыстоўваем інтэрнэт, каб адукавацца і атрымаць карысную інфармацыю, а на самай справе нас там разглядаюць і аналізуюць тыя, хто хоча прадаваць рэкламу. Дарослыя, якія думаюць, што з дапамогай устаноўленых на камп'ютары фільтраў яны могуць абараніць дзяцей ад непажаданай інфармацыі, моцна памыляюцца. Таму галоўным унутраным фільтрам і асновай медыяінфармацыйнай адукаванасці павінна стаць развіццё ў падрастаючага пакалення крытычнага мыслення плюс веданне стратэгій і інструментаў для выкрыцця махлярства ў інтэрнэце. Ну і, вядома, каштоўнасці. Чалавекам з каштоўнаснай базай цяжка маніпуляваць.

## ВІРТУАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ

**«ЗВЯЗДА»:** ***Сучасныя школьнікі большую частку інфармацыі атрымліваюць не з кніг, як гэта было раней, а ў інтэрнэце. Чым, на ваш погляд, чытанне кніг адрозніваецца ад чытання інфармацыйных інтэрнэт-матэрыялаў? І як чытанне з экрана ўплывае на ўспрыманне і разуменне інфармацыі?***

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Інтэрнэт-прастора ўяўляе сабой своеасаблівую кашу, дзе можна знайсці ўсё: і сайты ўльтраправых арганізацый, і блогі, і забаўляльныя рэсурсы, і сур'ёзныя навуковыя работы. А па факце такі інфармацыйны «фаст-фуд» прыводзіць да стомленасці мозгу, які «аб'ядаецца» інфармацыяй. Вядомы піяршчык Джэк Траўт параўнаў мозг чалавека з губкай, перапоўненай вадой. У такой сітуацыі, каб палегчыць сваю долю, ён пачынае браць толькі самае лёгкае і яркае, а ўсё, што патрабуе разважанняў, ігнаруе. З экранаў мы атрымліваем толькі мноства слабазвязаных паміж сабой фактаў. Адсутнічае логіка, губляецца прычынна-выніковая сувязь... Французскія медыяпсіхолагі нават увялі такое паняцце, як віртуальная калектыўная свядомасць. Інтэрнэт-аўдыторыя з гатоўнасцю «праглынае» ананімныя фэйкавыя паведамленні.

**Міхаіл КУДЗЕЙКА:**

— Адкуль з'явілася кліпавае мысленне? Гэта рэакцыя чалавека на празмернасць інфармацыі. Прычым кліпавае мысленне ўласцівае не толькі дзецям, але і нам, дарослым. Як мы рэагуем на вялікую колькасць інфармацыі? Правільна, у нас выпрацоўваецца ахоўная рэакцыя: штосьці мы ігнаруем, за штосьці наша ўвага чапляецца, штосьці мы праглядаем толькі павярхоўна, чытаем па дыяганалі. Празмернасць інфармацыі не дазваляе нам пагрузіцца ў нешта адно. Канешне, у кожнага ёсць свае прыхільнасці ў інфармацыі, кожны сам размяжоўвае галоўнае і другаснае. А можа быць, гэта і нядрэнна — выхопліваць з патоку толькі самае галоўнае? Толькі трэба навучыць гэтаму і дзяцей... **У адукацыйнай практыцы трэба ўлічваць, што кліпавасць мыслення задае новы дынамізм пазнавальнай дзейнасці, што для новага пакалення ўласцівы феномен дзіцячай шматзадачнасці,** калі дзіця, седзячы за камп'ютарам, адначасова кантактуе ў чаце, займаецца пошукамі ў сеціве, спампоўвае музыку, спрабуе рабіць дамашняе заданне і пры гэтым п'е сок ці жуе бутэрброд. Ім трэба шмат убачыць, зрабіць, на многае адрэагаваць. Шматзадачнасць прымушае працаваць іх мозг у іншым рэжыме, павышаецца хуткасць псіхічных працэсаў. І ўсё гэта трэба ўлічваць пры іх навучанні і выхаванні.

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Часта, калі мы не разумеем таго, што адбываецца, успрымаем гэта крытычна. Па-ранейшаму спрабуем усё вымяраць уяўленнямі XX стагоддзя, хоць жывём ужо ў іншую эпоху — інфармацыйнага грамадства. І раней былі дзеці, якія не чыталі. Можа быць, дзякуючы інтэрнэту, дзеці сталі нават больш чытаць, таму што там чытаюць нават тыя, хто ніколі не трымаў кнігу ў руках.

**Тамара МАЦКЕВІЧ:**

— Шмат дарослых спрабуюць выцягнуць дзяцей з інтэрнэту, даць ім альтэрнатыву ці ўвогуле забараніць. Але такія падыходы ў XXI стагоддзі не працуюць. Давайце прыгадаем, ці часта пішуць сачыненні сучасныя школьнікі? А ў сацыяльных сетках ім даводзіцца фармуляваць свае думкі хутка і лаканічна — гэта ўменне, якога раней у іх не было.

**Эла ЯКУБОЎСКАЯ:**

— Калі гаварыць пра сацыяльныя сеткі, то мы імі карыстаемся, а дзеці там жывуць. І яны проста не паспяваюць аналізаваць увесь той паток інфармацыі, што на іх навальваецца ў інтэрнэце. Большасць падлеткаў у першую чаргу рэагуюць на навіну, якая суправаджаецца прыгожай карцінкай. Давайце прызнаемся, што далёка не кожны дарослы ўмее ацэньваць інтэрнэт-сайты. А дзеці гэтай навуцы вучацца літаральна за некалькі заняткаў. Проста трэба паказаць маркеры, якія дзіця павінна бачыць, заходзячы на той ці іншы сайт. **Праверка праўдзівасці інфармацыі — навык, які трэніруецца гэтаксама, як і матэматычны навык, як навык рашэння фізічных задач.**

Наконт чытання скажу, што я працавала з рознымі вучнямі (і слабымі, і моцнымі) і мушу канстатаваць, што не чытаюць ні першыя, ні другія. Затое яны глядзяць (сёння на змену тэкставай інфармацыі прыйшла візуальная), таму я кажу бацькам: «Не пытайцеся ў іх, што яны прачыталі, а лепш запытайцеся, што яны апошняе паглядзелі?» Адназначна гэта будзе YouTube, можа быць, вы даведаецеся і пра папулярных у моладзі відэаблогераў, да меркавання якіх яны прыслухоўваюцца. Калі падлеткі вырашаюць, які фільм будуць глядзець, яны не вывучаюць кінарэйтынгі, не звяртаюцца да дарослых, а адштурхоўваюцца ад інфармацыі, якую пачулі ад відэаблогераў. Я была крыху здзіўлена, калі даведалася, што маіх дзесяцікласнікаў зачапіў фільм «Сусвет Стывена Хокінга». Гэта не забаўляльны фільм, тым не менш... І менавіта па парадзе сваіх вучняў я паглядзела брытанскі фантастычны серыял «Чорнае люстэрка», скразная тэма якога — уплыў інфармацыйных тэхналогій на чалавецтва і чалавечыя адносіны. Для мяне стала адкрыццём, што менавіта дзеці мне яго падказалі. Таму і бацькам я параіла б сесці з сынам ці дачкой разам і паглядзець тое, што цікавае не вам, а вашаму дзіцяці. Паверце, вы адкрыеце яго для сябе па-новаму. Калі дзіця чытае, яно застаецца са сваімі думкамі сам-насам, не разважае ўголас, а калі глядзіць, яму трэба абавязкова падзяліцца ўбачаным, з кімсьці гэта абмеркаваць...

**Міхаіл КУДЗЕЙКА:**

— Самыя папулярныя на сённяшні дзень, вядома, менавіта экранныя медыя. У іх прысутнічае эфект саўдзелу і суперажывання героям. Калі мы глядзім кіно, то раствараемся ў яго прасторы, усё прапускаем праз эмацыянальную сферу, нам падносяць жыццёвую гісторыю ў сціслым выглядзе, вось чаму кінамастацтва валодае велізарным выхаваўчым і развіццёвым патэнцыялам. Праўда, **часта экранныя медыя ідуць на тое, каб даць гледачу самы лёгкі змест, таму сёння вельмі шмат нізкапробных кінаматэрыялаў.** Дзяцей, ды, шчыра кажучы, і дарослых, трэба вучыць чытаць кінатэкст, а не бачыць толькі сюжэт, вучыць адчуваць, суперажываць, аналізаваць і ацэньваць. Спосабаў далучэння да кінамастацтва можа быць шмат: дыскусійны клуб, кіналекторый, стварэнне тэматычнага блогу, дзелавой гульні «Здымаем кіно», школьнага кінаклуба. Галоўнае — памятаць, што калі мы толькі сядзім і глядзім — гэта проста прагляд. А, напрыклад, у рамках школьнага кінаклуба яго ўдзельнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з дасягненнямі сучаснага кінематографа і прааналізаваць вопыт мінулага, абмяняцца думкамі і ўражаннямі, пачуць меркаванні спецыялістаў, на тэарэтычным і практычным узроўні спазнаць сакрэты кінаіндустрыі, пашырыць свае ўяўленні пра навакольны свет — гэта працэс фарміравання медыяадукаванасці ў адносінах да кінамастацтва, праяўленне ўменняў чытаць і інтэрпрэтаваць кінатэкст.

## МАГІЯ САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТАК

**«ЗВЯЗДА»:** ***Больш як 90 працэнтаў з тых, хто нарадзіўся ў XXI стагоддзі, маюць акаўнты ў розных сацыяльных медыя. Між іншым, старэйшаму пакаленню ёсць над чым задумацца: 80 працэнтаў «жыхароў» сацсетак давяраюць меркаванню сваіх анлайн-сяброў больш, чым сябрам у рэальным жыцці. Якіх правілаў павінны прытрымлівацца падлеткі ў сацыяльных сетках? І ці можна зайдзейнічаць гэты інтэрнэт-рэсурс у навучанні?***

**Алена ПАЛЕЙКА:**

— Вядома, што ў развітых краінах свету спажыванне медыяпрадуктаў падлеткамі займае да 10 гадзін штодня. Шмат часу маладыя людзі (як і іх бацькі) праводзяць у сацыяльных сетках. Але трэба адзначыць, што розныя пакаленні паралельна суіснуюць у розных сетках. Як трапна заўважыў шведскі медыяпедагог Ёран Андэрсан, «калі ў Фэйсбук прыйшлі бацькі, дзеці пайшлі ў Інстаграм». Гэта цікавае і вельмі важнае назіранне... Амерыканскі медыяэколаг Лэнс Стрэйт апісаў неадназначныя праявы інтэрнэт-экспансіі на ўзроўні асобы: **«Мы ствараем праект саміх сябе праз інтэрнэт, ствараем сваё alter ego, электронных двайнікоў, свае адлюстраванні. Мы павялічваем колькасць роляў, якія іграем, колькась «Я», якія прымяраем. Мы прыдумляем псеўданімы, ствараем аватаркі, што прыводзіць да дэфармацыі асобы. Мы пакідаем сляды нашай асобы, памнажаючы сваё «Я» да ўзроўню, беспрэцэдэнтнага ў сусветнай гісторыі».**

Зразумела, што сёння ёсць нейкія базавыя правілы, якія трэба ведаць пра сацыяльныя сеткі. Па-першае, тое, што інфармацыя ў інтэрнэце захоўваецца намнога даўжэй, чым у памяці людзей: калі яна туды трапіла, то застаецца там вельмі надоўга. І нават пасля выдалення даных з сеткі ўсё роўна застаецца іх след, напрыклад, на серверах пошукавых сістэм. Усё, што можна знайсці пра асобу ў інтэрнэце, уплывае не толькі на яе медыяімідж (а ён, у сваю чаргу, можа змяняцца ў залежнасці ад таго, якой інфармацыяй чалавек падзяліўся з сябрамі ці на якой старонцы пакінуў «лайк»).

# правілы выжывання...



Тамара МАЦКЕВІЧ.



Эла ЯКУБОЎСКАЯ.



Наталля КАТЧАНКА.



Ала ЛАЗІЦКАЯ.

Па-другое, у стасунках з іншымі карыстальнікамі сетак трэба сачыць за правіламі этыкету гэтаксама, як і ў рэальных стасунках з людзьмі. Ананімнасць не азначае, што можна парушаць нормы маралі, паколькі заўсёды за «нікам» і «аватарам» стаіць рэальны чалавек, якога можна пакрыўдзіць...

Па-трэцяе, педагогі павінны тлумачыць вучням, што кожны карыстальнік сацыяльных сетак таксама аўтаматычна становіцца крыніцай масмедыя. Шмат падлеткаў неабачліва выкладваюць у інтэрнэце інфармацыю, якую нельга там размяшчаць, і яны не разумеюць наступстваў сваіх бяздумных паводзін. Кожны, хто распаўсюджвае нейкую інфармацыю ў сацыяльных сетках або робіць перапост, павінен задумацца над тым, як яго дзеянні могуць паўплываць на іншых.

**Эла ЯКУБОЎСКАЯ:**

— Вельмі часта падлеткі, якія актыўна кантактуюць у сацыяльных сетках, адчуваюць сябе сацыяльна ізаляванымі ў рэальным свеце. Гэта новая форма сацыяльнага аўтызму. У некаторых краінах набывае ўсё большую папулярнасць ідэя «фэйсбук-залежнасці» — нястрымнай цягі да стасункаў у сацыяльных сетках за кошт астатніх аспектаў жыцця. Разам з тым сацыяльныя сеткі могуць быць і адным з самых магутных стымулаў для навучання. **Вельмі важна, каб вучні ўмелі правільна сфарміраваць сваю стужку навін у сацыяльных медыя.** Бо яна можа складацца як з фатаграфій котачак, так і з ролікаў, якія дапамагаюць засвоіць законы фізікі, расказваюць пра тайны Сусвету, вучаць спраўляцца з рашэннем матэматычных задач, знаёмяць з робататэхнікай. І калі педагогі навучаць дзяцей гэта рабіць, то сацыяльная сетка перастане быць проста акенцам для забавак, а ператворыцца ў яшчэ адно акно ў вучобу.

Сацыяльная сетка — гэта месца, дзе можна займацца з групай вучняў адукацыяй. Для гэтага дастаткова стварыць чат і ў рэальным часе дзяліцца карыснымі спасылкамі, абмяркоўваючы іх, уносячы карэктывы. Выкарыстоўваць у такой працы можна любы кантэнт з інтэрнэту (аўдыя, відэа, тэкст і г. д.). Паралельна прапрацоўваюцца навыкі паводзін у інтэрнэт-прасторы (уменне працаваць з тэкстам, уменне даносіць інфармацыю так, каб яе зразумелі іншыя, пісьменнасць, навыкі павагі пры стасунках).

## КАЛІ ФІЗІКІ ПЛАЧУЦЬ?

**«ЗВЯЗДА»: *А як уменне крытычна аналізаваць інфармацыю можна адпрацоўваць на звычайных школьных уроках ці універсітэцкіх занятках? Як спалучыць медыяадукацыйныя задачы з навучальнай праграмай?***

**Ала ЛАЗІЦКАЯ:**

— Канцэпцыі медыяадукацыі ў нас няма. Спадзяёмся, што пакуль няма. Некаторыя ўвогуле асацыююць медыяадукацыю з інфарматызацыяй і памылкова лічаць яе мэтай навучанне выкарыстанню сучасных камп'ютарных і іншых лічбавых сродкаў і рэсурсаў. Але ў краіне ўжо дзейнічаюць 27 інавацыйных пляцовак па ўкараненні мадэлі фарміравання медыякультуры навучэнцаў. На мой погляд, самай перспектыўнай з'яўляецца інтэграцыя медыяадукацыі ў змест вучэбных прадметаў. Няма неабходнасці прыдумляць розныя спецкурсы і ламаць галаву, за кошт якога прадмета ўціснуць у навучальны план патрэбныя веды. Для павышэння медыядукаванасці падыходзяць урокі геаграфіі і гісторыі, хіміі і біялогіі, літаратуры і матэматыкі. Зразумела, што розныя тэматычныя раздзелы маюць розны медыяадукацыйны патэнцыял, дазваляюць рэалізаваць розныя аспекты медыяінфармацыйнай адукаванасці. Але ж няма такой тэмы, якая не дазваляе актуалізаваць пэўныя медыяінфармацыйныя кампетэнцыі. Задача сучаснага настаўніка — выявіць гэты патэнцыял і выбраць найбольш эфектыўныя спосабы інтэграцыі медыяадукацыі ва ўрочную дзейнасць. Атрымліваючы новую порцыю інфармацыі, вучні павінны навучыцца разглядаць яе з розных пазіцый, рабіць высновы адносна яе дакладнасці і каштоўнасці.

З уласнага досведу магу сказаць, што выкарыстанне разнастайнай медыяінфармацыі на школьных уроках мовы і літаратуры дазваляе навучыць выяўленню схаваных у ёй сэнсаў, разуменню светапогляду аўтара. На такіх матэрыялах вельмі зручна навучаць школьнікаў аргументацыі ўласных выказванняў і фарміраваць уменне не толькі слухаць, але і чуць апанента — адным словам, развіваць крытычнае мысленне.

**Эла ЯКУБОЎСКАЯ:**

— Мая задача — навучыць працаваць на ўроку фізікі з фізічнай інфармацыяй, якая сустракаецца ў медыякрыніцах. І калі медыйныя крыніцы інфармацыі будуць інтэграваныя ў кожны раздзел прадмета «Фізіка», вучні змогуць разам з прадметнымі кампетэнцыямі набываць і медыйныя. Вельмі карысная для фарміравання крытычнага мыслення работа з рэкламай. Дзеці, як правіла, цытуюць яе даслоўна, але абсалютна механічна. Дзякуючы частаму паўтарэнню змест рэкламы перастае ўспрымацца крытычна. Для прыкладу, у нас вельмі любяць рэкламаваць розныя цудадзейныя прыстасаванні. Пасыл зразумелы — калі ў цябе няма часу, каб хадзіць па ўрачах, ты купіў такі цуда-прыбор, і будзе табе шчасце. Разбіраемся разам з дзецьмі: хто прапануе гэту рэкламу і з якой мэтай? Ці выклікае давер «эксперт»? Чым можна пацвердзіць правільнасць назвы «апарат квантавай тэрапіі»? Што могуць азначаць тэрміны, якімі аперыруюць рэкламадаўцы: «квантавая медыцына», «паліфактарнае ўздзеянне», «бактэрыцыднае сіняе святло», «экалагічна бяспечныя выпраменьваннi»? Як чырвонае святло можа спраўляцца з хранічнымі захворваннямі? Ці можа сіняе святло аказваць заспакаяльнае і абязбольвальнае ўздзеянне? Што трэба ведаць, каб не «павесціся» на такую рэкламу?

Фізічныя памылкі сустракаюцца ў мастацкай, навукова-фантастычнай і вучэбнай літаратуры, шмат іх у кінафільмах. Узяць тую ж «Гравітацыю» ці «Інтэрстэлар». Ёсць жарт на гэту тэму: **«Глядзеў фільм і плакаў. — А чаму плакаў? — Таму што фізік!»** Прабачце, але шмат невераготнай інфармацыі распаўсюджваюць і журналісты. На экалагічныя тэмы такое напішуць! Можна прапанаваць вучням на ўроку выказаць аргументы «за» і «супраць» выкарыстання наступных загалоўкаў у СМІ: «Радыеактыўныя адходы выкідаюць проста пад ногі гараджанам!», «Грошы схільныя не толькі да інфляцыі, але і да радыяцыі», «У радыеактыўных сценах людзі могуць пражыць, ні пра што не здагадваючыся, дзясяткі гадоў!»

**Наталля КАТЧАНКА:**

— Настаўнікі замежнай мовы маюць шмат магчымасцей для медыяадукацыйнай дзейнасці на ўроку. Для ўвядзення вучняў у іншамоўную камунікатыўную сітуацыю, адпрацоўкі актыўнай лексікі, развіцця навыкаў вуснай мовы можна выкарыстоўваць любы фрагмент тэлеперадачы, ролік з інтэрнэту, вытрымку з артыкула, цэлы артыкул ці цытату вядомага чалавека. Можна дыскутаваць, абменьвацца думкамі па розных праблемах у класе, у сацыяльных сетках або пісаць на электронную скрыню.

На ўроках у пачатковых класах настаўнік развівае асноўныя медыйныя ўменні вучняў: карыстацца слоўнікамі — як электроннымі, так і друкаванымі, рэсурсамі школьнай бібліятэкі, самастойна выбіраючы літаратуру і ўсе неабходныя крыніцы для вырашэння канкрэтнай задачы. Вучні пачатковай школы ўжо разумеюць, што для станоўчага выніку пошуку патрэбнай інфармацыі неабходна правільна сфармуляваць запыт. Яны могуць з недаверам паставіцца да розных паведамленняў. Калі такое здараецца, ведаюць, што інфармацыю неабходна праверыць. Разумеюць, што для рознай аўдыторыі (для сяброў, настаўнікаў, бацькоў) паведамленне можа мець розны характар.

Па самых розных тэмах з 5-га па 11-ы клас можна выклікаць вучняў на дыскусію і прапанаваць абмеркаванне ў інтэрнэце. Гэта можа быць і абавязковае дамашняе заданне, і проста прапанова падтрымаць дыскусію.

Якая карысць ад такой формы работы? Дзякуючы сацыяльным медыя з'яўляецца разуменне, што кожны можа выказаць сваю думку і падзяліцца ёй з іншымі для таго, каб дасягнуць пастаўленай перад сабой мэты. Мы можам параўноўваць, ацэньваць, што добра, а што дрэнна, і ў выніку прымаць уласнае рашэнне. Мы можам каментаваць, абмяркоўваць і сумесна ствараць новую ідэю. Медыяадукацыя адкрывае новыя магчымасці і для настаўнікаў, і для вучняў у плане асэнсавання сучаснай рэальнасці і нашай ролі ў ёй.

Асноўны матэрыял, з якім настаўніку прасцей за ўсё працаваць на дасягненне вышэйпералічаных мэт, — гэта друкаваныя і электронныя версіі замежных газет. У старшых класах я тлумачу: **прачытаўшы толькі загаловак, цяжка спрагназаваць, пра што будзе артыкул.** Ёсць такія загалоўкі, па якіх з першага погляду амаль што немагчыма прадказаць змест. Але тым яны і цікавыя. У старшых класах вучні асвойваюць шэраг кампетэнцый, якія складаюць крытычнае мысленне. Падзеі, што адбываюцца ў свеце, вельмі часта асвятляюцца з розных бакоў, нават з процілеглых. Дзе знайсці зерне праўды? Каму верыць? Настаўнік можа прапанаваць параўнаць два артыкулы па адной праблематыцы, знайсці ў кожным з іх аргументы, на якія аўтары акцэнтуюць увагу. Зрабіць высноvarу, чые аргументы гучаць больш пераканаўча і чаму.

**Вельмі важна растлумачыць вучням, што існуюць факты і меркаванні, і навучыць іх адрозніваць першае ад другога.**

**Алена ПАЛЕЙКА:**

— Сённяшняе грамадства — інфармацыйнае, і ўсе змены ў ім адбываюцца імкліва. Ёсць меркаванне пра два галоўныя дасягненні ці, умоўна кажучы, помнікі, якія паставіла сабе інфармацыйнае грамадства, — гэта Вікіпедыя і YouTube. Напрыклад, Вікіпедыя — фактычна помнік самаарганізацыі нашага грамадства: «хуткая энцыклапедыя» («wiki» ў перакладзе азначае «хуткі») ствараецца (і пастаянна рэдагуецца, удасканальваецца) добраахвотнікамі з усяго свету на 283 сусветных мовах. Свабодная энцыклапедыя ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных вэб-сайтаў у свеце. І гэта прыклад таго, як можна разам вучыць і вучыцца. Дарэчы, беларусы па сваёй актыўнасці ў напаўненні Вікіпедыі знаходзяцца на 56-м месцы. Гэта людзі, якія займаюцца стварэннем менавіта беларускага кантэнту, і свае артыкулы для «хуткай энцыклапедыі» яны пішуць у тым ліку і на беларускай мове. Апошнім часам нашы выкладчыкі вельмі паспяхова працуюць з Вікіпедыяй як платформай для навучання: студэнт замест рэферата атрымлівае заданне стварыць вікіартыкул па пэўнай тэме. Гэта азначае, што трэба не толькі навучыцца карыстацца даволі простымі шаблонамі стварэння тэкстаў у вікі, але ў першую чаргу ўмець правяраць крыніцы інфармацыі, крытычна яе ацэньваць, параўноўваць артыкулы на розных мовах і г. д. У свеце работа з Вікіпедыяй — ужо асобны кірунак у медыяадукацыі, які паспяхова развіваецца. Яму нават прыдумалі назву — «вікідыдактыка». Ну а відэаблогерства — цяпер папулярная форма навучання праз інтэрнэт і вельмі запатрабаваная. Паглядзіце, колькі відэалекцый, майстар-класаў, урокаў можна паглядзець на YouTube. Школьны ютуб-канал — гэта наша рэальнасць.

**Дзмітрый ГУБАРЭВІЧ:**

— Мы праводзілі апытанне сярод выкладчыкаў БДУ і іншых універсітэтаў (цяпер рыхтуем да публікацыі артыкул). І адно з пытанняў гучала так: «Як павінна быць арганізавана развіццё медыяадукаванасці?» Толькі некалькі чалавек з агульнай колькасці апытаных заявілі, што гэта не з'яўляецца актуальнай задачай для сучаснай універсітэцкай адукацыі, а астатнія галасы падзяліліся. Прыкладна палова апытаных сказалі, што медыяадукацыя павінна быць элементам у кожным навучальным курсе, інтэгравацца ў яго. А другая палова выказала меркаванне, што медыяадукацыя павінна быць асобным прадметам, таму што ёсць шэраг пытанняў, якія не ўпісваюцца ў змест прадметаў, якія яны выкладаюць.

Тых, каму гэта тэма цікавая, **мы запрашаем у «Медыямайстэрню ўніверсітэцкага выкладчыка».** Цэнтр развіцця праблем адукацыі БДУ арганізаваў ужо тры такія медыямайстэрні, прычым кожны раз іх змест абнаўляецца больш чым напалову. Майстэрня спалучае два кірункі: мы асвойваем пэўныя інфармацыйныя тэхналогіі, якія дапамагаюць у працэсе выкладання, але пры гэтым развіваем і медыяадукаванасць саміх выкладчыкаў. Ёсць яшчэ адна задача — прапанаваць выкладчыкам метадычныя інструменты, якія дапамогуць ім развіваць медыяадукаванасць у іх студэнтаў.

Напрыклад, «Медыямайстэрня ўніверсітэцкага выкладчыка — 2017» налічвала сем метадычных семінараў. Удзельнікі медыямайстэрні вывучалі, як можна выкарыстаць сеткавыя рэсурсы ў працэсе выкладання, вучыліся аналізаваць інфармацыйныя паведамленні, разбіралі, як эфектыўна ўключыць у змест заняткаў паказ фільмаў і фатаграфій, як стварыць відэалекцыю і гэтак далей. Паміж семінарамі ўдзельнікі выконвалі заданні для самастойнай працы. Кожныя новыя сустрэчы традыцыйна пачынаюцца з абмеркавання вынікаў выканання «дамашняга» задання. Гэтак нашы ўдзельнікі запісвалі з дапамогай смартфона або планшэта прэзентацыйнае відэа пра сябе і навучальны курс, распрацоўвалі і рэалізоўвалі навучальнае заданне, накіраванае на засваенне студэнтамі прылад крытычнага аналізу інфармацыі, падбіралі відэа і фота для навучальнага курса.

**Алена РАДЗЕВІЧ:**

— Сёння важна, каб вучань не толькі ведаў, як «гугліць», але і ўмеў ацаніць атрыманае і прыняць правільнае рашэнне. Гэта можна лічыць адной з самых актуальных адукацыйных задач. Англійскі пісьменнік-фантаст Ніл Гейман у сваім артыкуле «Чаму наша будучыня залежыць ад чытання?» выказаў наступную думку: «Інфармацыя мае кошт, а правільная інфармацыя неацэнная. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва мы жылі ў часы недахопу інфармацыі. Яна была каштоўнай рэччу. І тыя, хто валодалі ёю, маглі разлічваць на ўзнагароду. У апошнія гады мы адышлі ад недахопу інфармацыі і падышлі да перанасычэння ёю. **Зараз задача не ў тым, каб знайсці рэдкую кветку ў пустыні, а ў тым, каб адшукаць канкрэтную расліну ў джунглях.** Нам патрэбная дапамога ў навігацыі, каб знайсці сярод гэтай інфармацыі тое, што нам сапраўды трэба».

Тры гады таму беларускія педагогі распачалі праграму ўкаранення медыяадукацыі ў школьнае выкладанне. Стварылі дыстанцыйны курс падтрымкі настаўнікаў. Напісалі дапаможнікі па медыяадукацыі. Сёння некалькі дзясяткаў школ маюць інавацыйныя пляцоўкі па фарміраванні медыяадукаванасці і медыякультуры, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі. Аднак асноўная праца па фарміраванні ў вучняў крытычнага мыслення ў нас яшчэ наперадзе...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

**(Поўны тэкст круглага стала чытайце на сайце www.zviazda.by)**

## Парог па профільных прадметах трэба павышаць

**Рэктары беларускіх ВНУ прапанавалі Міністэрству адукацыі разгледзець магчымасць павышэння парогавых значэнняў прахадных балаў па профільных прадметах. На іх думку, гэта забяспечыць больш якасны прыём ва ўстановы вышэйшай адукацыі.**

Пры гэтым усе рэктары аднагэначна падтрымліваюць ЦТ як аптымальную форму правядзення ўступных выпрабаванняў.

— На працягу многіх гадоў мы праводзім аналіз карэляцыі балаў, атрыманых нашымі першакурснікамі на ЦТ, з вынікамі першай сесіі, — паведаміла падчас пасяджэння Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі з удзелам міністра адукацыі **рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля БАРАНАВА.** — І ў пераважнай большасці выпадкаў бачым станоўчую карэляцыю. Таму прыём па выніках ЦТ нас цалкам задавальняе.

Таксама на пасяджэнні прагучала прапанова скараціць тэрміны рэгістрацыі на ЦТ. Да гэтага рэгістрацыя стартавала 2 мая і праводзілася на працягу месяца. Рэктары прапануюць скараціць яе да трох тыдняў — з 10 мая па 1 чэрвеня.

Яшчэ адна з агучаных прапаноў — ажыццяўляць прыём выпускнікоў устаноў сярэдняй адукацыі на завочную форму навучання (як на бюджэтную, так і на ўмовах аплаты) толькі пры наяўнасці стажу работы. «Завочная і дыстанцыйная формы ад пачатку прызначаліся для тых, хто працуе», — падтрымаў ініцыятыву **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

У той жа час прапануецца падтрымаць выпускнікоў устаноў прафтэхадукацыі і каледжаў, якія працуюць па спецыяльнасці, а таксама грамадзян, якія прайшлі тэрміновую воінскую службу ці службу ў рэзерве і маюць рэкамендацыі воінскіх часцей.

# ПРАПАНОВЫ ТУРСЕЗОНА

## Бабуль — у Індыю, маладых — у Грузію, цікаўных — у Беларусь

**Як заўважаюць тураператары, нашы турысты «выраслі, разбіраюцца ў краінах і культурах, разумеюць, што трэба ўлічваць кошт візы». Такія напрамкі, як Турцыя, Балгарыя, адпрацаваны настолькі «ў плюс», што сёння самі падарожнікі могуць багата расказаць пра гэтыя краіны. Часам і паважны ўзрост не ўплывае на беларусаў, бабулі і дзядулі не баяцца працяглых пералётаў. Нашы пенсіянеры могуць паляцець на Шры-Ланку і ў Індыю.**


Фота БЕЛТА

### Самі для сябе

І хоць асноўная маса адпачывальнікаў выбірае традыцыйны напрамак, сёння агенцтвы могуць выправіць турыстаў фактычна ў любую кропку свету. Дарэчы, попыт на экзотыку быў заўсёды. У асноўным беларусы цікавяцца Азіяй, але часам пытаюцца пра адпачынак ля акіяна, на астравах, куды складана дабрацца. Па такіх напрамках цяжка сплanaваць адпачынак самастойна, бясспрэчна, спецыяліст зможа падабраць найлепшы варыянт.

Паступова прырастае колькасць і тых, хто гатовы адкрываць свет па ўласна распрацаванай праграме. Турыст стаў менш пужлівым, людзі самі складаюць маршруты, бранiруюць гатэлі, часта выбудоўваюць праграму з мінімальным бюджэтам, падарожнічаюць па замежжы аўтастопам. Да паслуг жа тураператараў часцей звяртаюцца тыя, хто прагне камфорту.

Самыя даступныя па кошце сёння Балгарыя, Чарнагорыя, Егіпет. Чарнагорыя ў сярэднім пацягне 800 еўра на 10 дзён на дваіх, Балгарыя столькі ж. Турцыя на дваіх ад тысячы долараў на ўсё ўключана ў атэлях ад трох зорак, «чацвёркі» і «пяцёркі» ідуць за 1200—1500 і вышэй. Летам у Егіпце спякотна, таму выбіраемся туды ў міжсезонне (цэны ад 800 долараў).

### Не морам адзіным

Насамрэч, многім турыстам, якія выбіраюць толькі такі адпачынак, як «гатэль ды пясок», усё роўна, куды ляцець. Такіх людзей шчыра шкада. У кожнай краіне ёсць што паглядзець, і аператары вам могуць гэта падказаць. Схадзіце на кірмашы той жа Турцыі, пачастуйцеся іх прысмакамі, пазнаёмцеся з рэлігіяй розных краін, не абмініце экскурсій па старажытнай Грэцыі. Адчуйце дух кожнай мясціны. Выбірайцеся ўглыб краін, гэта моцна мяняе светаўспрыманне, часам пасля такіх адкрыццяў людзі пачынаюць больш цаніць тое, што маюць на радзіме.

Паляўнічыя за эмоцыямі сёння выбіраюць экскурсійныя туры па Еўропе. Прычым сярод іх ёсць і такія, што складаюцца з чыстай «экскурсіёнкі» (калі наведваюцца сталіцы і гарады розных краін), і тыя, дзе пазнавальныя падарожжы спалучаюцца з адпачынкам на моры. Адным з такіх цікавых і запатрабаваных сёння напрамкаў з'яўляецца іспанскі. У кошт уваходзіць праезд, пражыванне ў транзітных гатэлях са сняданкамі, экскурсіі па праграме. Давядзецца яшчэ раскашэліцца на візу, асобныя экскурсіі ці ўваходныя білеты ў музеі. Ёсць яшчэ экскурсійныя туры з адпачынкам у Харватыі, Чарнагорыі, Грэцыі, але іх менш.

Як заўважаюць тураператары, у апошнія гады людзі сталі пытацца пра зніжкі, надта часта пачалі гучаць словы «гарачыя туры». Як правіла, падобных тураў не бывае летам. Якім бы ні быў крызіс, запаўняльнасць гатэляў у сезон — 98—99 працэнтаў. І падобныя пуцёўкі — рэдкасць. Так, вы можаце паляцець танна, але страціце ў якасці. Затое «гарачыя туры» можна шукаць у міжсезонне.

Калі ж людзі хочуць сэканоміць, — самае простае, гэта ранняе браніраванне. Так, турысты, якія планавалі летні адпачынак з кастрычніка-лістапада, сэканомілі на пуцёўцы 40 працэнтаў (прычым зніжка ідзе і на пералёт, і на пражыванне).

### Невядомая Літва

Тым, хто аддае перавагу адпачынку ў краінах па суседству, трэба ведаць, што ў гэты сезон вы зможаце адкрыць для сябе нешта новае. Напрыклад, вы ўпэўнены, што ўжо добра вывучылі Літву? Так, сёння там чакаюць турыстаў і ў менш нам вядомай заходняй частцы. Прычым тут багата прапаноў для гасцей з рознымі запытамі: гэта можа быць падарожжа на караблі па дэльце Нёмана, прагулкі па пясчаных дзюнах Куршскай касы, назіранне ў дзікай прыродзе за птушкамі. У Клайпедскім рэгіёне прапануюць наведаць выставы, музеі, начныя клубы. Можна самім скласці маршрут ці звярнуцца ў цэнтр турыстычнай інфармацыі, які ёсць у кожным самакіраванні (напрыклад, Клайпедская акруга складаецца з сямі самакіраванняў). Тут падкажуць і што паглядзець, і як падарожнічаць (на аўто, веласіпедзе ці грамадскім транспарце), дзе паесці і спыніцца на начлег. Дзень у Літве для аднаго чалавека можа абысціся ад 10 да 100 еўра. Усё залежыць ад таго, што вы выбераце: прыватны сектар (тут развіты сельскі турызм) ці гасцініцу, кавярню ці рэстаран.

### Сонечнае вяселле

Усё часцей беларусы сталі выбіраць адпачынак у Грузіі. Людзі спакушаюцца не толькі на мора, горы, пляжы з «магнітным» пяском, вабяць іх і традыцыі краіны. Так, адна з прапаноў ад турагенцтваў — зладзіць у краіне вяселле па грузінскіх традыцыях. Прычым распішуць маладых там незалежна ад таго, грамадзянамі якой краіны яны з'яўляюцца. Гасцей навучаць народным танцам і пакажуць, як весці застолле. Таксама сярод прапаноў у гэтым кірунку — вінныя туры, гістарычныя, паломніцкія, аздараўленчыя. Асноўны расходны артыкул для беларусаў, якія выберуць такі адпачынак, — пералёт, само ж пражыванне і харчаванне ў Грузіі недарагое. Як запэўніваюць тураператары, калі ў нас два чалавекі сходзяць у рэстаран і выйдуць адтуль паўгалодныя, то ў Грузіі за такую ж суму чатыры турысты добра «пагудзяць», чачы вып'юць і «Дзе ж ты, мая Суліко» праспяваюць. Суткі эканом-класа, толькі са сняданкамі, у Грузіі могуць каштаваць 17—20 долараў.

### Круіз танней за гатэль?

Падарожжа на марскім лайнеры, дзе круглыя суткі віруе жыццё, з заходам у парты розных краін з найпрыгажэйшымі мясцінамі — гэта казка? Аказваецца, не. У Беларусі ўжо больш за сем гадоў прадаюцца такія марскія падарожжы. Выбіраць можна з 10 тысяч маршрутаў, на лайнеры ад 4 да 6 зорак, працягласцю ад 4—5 дзён да больш доўгай кругасветкі (звыш 100 дзён). Умяшчальнасць лайнера ад 2,5 тысячы да 6 тысяч толькі турыстаў (плюс каманда). На борце могуць быць нават паслугі, якіх не сустрэнеш і на дарагіх курортах. Уявіце, людзі знаходзяцца пасярод мора, а на лайнеры — ледзяны каток, сёрфінг, скалалажанне, тарзанка, бары, што плаваюць паміж палубамі, жывыя расліны і трава, цэлыя вуліцы, па якіх можна гуляць...

Магчыма, стрымлівае развіццё такога адпачынку боязь «марской хваробы». Але гэта міф, што там можа загайдаць. Фактычна амаль усе перамяшчэнні начныя. Хуткасць лайнера 40—45 км у гадзіну. Плюс там ёсць антыгайданкавая сістэма. Як заўважае прадстаўнік кампаніі, якая адной з першых пачала прапаноўваць такія падарожжы беларусам, у міжсезонне круіз на лайнеры можа быць таннейшы за адпачынак у Егіпце. Напрыклад, летась у лютым каюта без акна на лайнеры 5 зорак з Гаваны з заходам у Беліз, Гандурас і Мексіку каштавала на дваіх 400 еўра (плюс авіяпералёт). І гэта на 8 дзён! Бываюць такія смешныя цэны, калі на рынак выходзяць новыя кампаніі. Самае папулярнае сёння Міжземнамор'е. Больш прасунутыя падарожнікі выбіраюць і Паўднёва-Усходнюю Азію, і Лацінскую Амерыку, і Кубу (там знаходзяцца парты, адкуль пачынаюцца круізы). Сярод запатрабаваных марскіх падарожжаў — круізы па нарвежскіх фіёрдах. Уласна, некаторых беларусаў спыняе няведанне замежнай мовы і такім лепш падыдуць падарожжы з партоў у Піцеры.

### Актыўная Беларусь

Аматарам актыўнага адпачынку зусім не абавязкова траціцца на цягнікі-самалёты. Цікавыя варыянты зусім побач. Чаму б, напрыклад, не выбрацца ў беларускую байдарачную аграсядзібу «Узлянка». Лазня па-чорнаму, сапраўдная травяная пляцоўка для гульняў з мячом, тарзанкі вісяць ля вады, тэніс, бадмінтон, дартс, веласіпеды, прагулка на балота, выбірайце — што даспадобы. Пражыванне ад 20 да 30 рублёў, байдарачная экскурсія ад 10 да 25 рублёў на чалавека. Уласна, сёння гаспадары многіх аграсядзіб прапануюць насычаныя праграмы, на іх базе могуць быць і міні-фермы і этна-музеі, хтосьці праводзіць майстар-класы (ад гатавання і дызайнерскіх урокаў, да збору зёлак і аздараўляльнай гімнастыкі).

Мяняецца і арганізаваны адпачынак для заезджых турыстаў. Напрыклад, асобныя тураператары ўжо распавядаюць гасцям з Расіі пра «беларускі кландайк», паданні, чароўныя мясціны, і нават «агурочныя вёскі», сярод навінак, на якія заваблiваюць суседзяў — экскурсіі па знакавых мясцінах са спыненнем у гатэлях з відам на старадаўнія замкі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

# ДЗЕ РОБЯЦЬ ВАЗЫ ДЛЯ ШЭЙХА

## Вытворчы турызм на шклозаводзе «Нёман» набірае абароты



**У гэтым годзе паток турыстаў на прадпрыемства значна павялічыўся. У асобныя дні тут прымаюць да 20 груп — як беларускіх, так і замежных. За апошні час узрасла колькасць турыстаў з Прыбалтыкі і Польшчы.**

Усплёск вытворчага турызму на завод у Бярозаўку пачаўся летась, калі на прадпрыемстве пабывала больш за 16 тысяч наведвальнікаў. Сёлета плануюць прыняць значна больш. Экскурсавод завода Тамара Кенць паведаміла, што днямі сустракалі некалькі груп з Эстоніі, Расіі, Казахстана. Часта прыязджаюць турысты, якія праходзяць аздараўленне ў беларускіх санаторыях. Ахвотна прымаюць на заводзе і адзіночак. Кожны, хто спыніцца каля завода альбо прыедзе спецыяльна, можа разлічваць на экскурсію.

— Вытворчасць шкляных вырабаў выклікае інтарэс, бо ў нас гэта ручная работа, і сам працэс, вядома, зачароўвае, — заўважае Тамара Кенць. — Таксама пры наведванні нашага музея кожны турыст атрымае ў падарунак хрустальны сувенір.

У музеі сабраны самыя ўнікальныя вырабы, якія ствараюць мясцовыя майстры. Адсюль ідуць сувеніры на «Славянскі базар», «Фестываль нацыянальных культур», хакейныя і футбольныя турніры, розныя святы і конкурсы...

Калі гаварыць пра модныя тэндэнцыі, то некаторыя вярнуліся з 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Напрыклад, у той час стваралася шкляная чорна-белая калекцыя ваз, але на вырабы не было попыту. Сёння вазы выдатна ўпісваюцца ў сучасны стыль хайтэк, якому ўласціва шырокае прымяненне шкла. Прыгожа выглядаюць вырабы з дымчатага і матавага шкла. Майстар вырабляе іх па асобнай тэхналогіі, шліфоўка таксама адбываецца ўручную. У свой час вырабы з такога шкла прыйшліся да густу арабскаму шэйху, і набор быў адпраўлены ў Эміраты.

— Еўропа любіць мінімалізм, а Усход — больш яркія і мудрагелістыя формы, — кажа Тамара Кенць. — Многа вырабаў робіцца па індывідуальных замовах. Аднойчы на заводзе атрымалі заказ на хрустальную каляровую Шапку Манамаха. Праўда, імя заказчыка не выдаецца.

Ёсць свае сакрэты і ў майстроў. Напрыклад, як дасягнуць эфекту мармуру альбо стварыць на вырабах карціну. Дарэчы, гэтым займаецца мастак Раміль Мазітаў, які алмазам піша па шкле розныя выявы, партрэты альбо пейзажы.



Найбольш цікава назіраць за работай шкляроў, якія працуюць каля гарачых печаў. Відовішча сапраўды магічнае. Бо цяжка адарваць позірк ад шкляной масы, якая льецца, накручваецца, ржацца і выдуваецца майстрам. Кожны робіць свой від прадукцыі. Нават у вытворчасці простых, здаецца, рэчаў ёсць свае нюансы. Напрыклад, для еўрапейскіх заказчыкаў стаканы для віскі робяць толькі ручным спосабам, бо сценка іх павінна быць тонкай, як лісток паперы. На вытворчай лініі такога не атрымаеш, тлумачыць спецыяліст завода.

Падчас экскурсіі можна даведацца, чым адрозніваецца шкло ад хрусталю. Аказваецца, шкло больш цёплае і награваецца ад рук, а хрусталь — не. Да таго ж ён і больш трывалы, яго складаней разбіць. Калі глядзець праз шкло, выява будзе трохі павялічанай, хрусталь прадметы раздвойвае, але не павялічвае. Хрустальны «дзынь» звонкі і значна даўжэйшы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

■ Самадыягностыка

# Каб хутчэй пачаць лячэнне

**Вось так выглядае экспрэс-тэст на ВІЧ па сліне. Зараз ён ёсць у аптэках Гомельскай вобласці, аднак даволі хутка будзе прадавацца ў сталіцы, а пасля і па ўсёй краіне.**



Фота Надзеі БУЖАН.

На малюнках паказана, як праводзіць самадыягностыку, але разам з тэстам выдаюць і інструкцыю на рускай мове, дзе крок за крокам апісана, што ў якой паслядоўнасці рабіць. Такі метад даследавання можна назваць папяровым, бо па ім нельга выстаўляць дыягназ аб наяўнасці ВІЧ-інфекцыі. А таму, калі тэст пакажа станоўчы вынік, што гаворыць аб наяўнасці ў сліне антыцелаў да ВІЧ, далей неабходна прайсці тэст-пацвярджэнне ў медустанове. Для гэтага ў Мінску, напрыклад, варта звяртацца па адрасе: вул. К. Цэткін, 4, паверх 3, каб. 301. Можна пазваніць і на гарачую лінію 8 017 200 28 83.

Кансультацыю і дыягностыку можна прайсці ананімна і бясплатна. Інфармацыя аб ВІЧ-статусе захоўваецца ў строгай канфідэнцыяльнасці. Чым хутчэй выявіцца інфекцыя, тым раней можна пачаць лячэнне — антырэтравірусную тэрапію, якая падаўжае жыццё і папярэджвае перадачу віруса свайму партнёру ■

■ Праблемы ўзросту

# ГЛЯДЗІЦЕ, НЕ ПАДАЙЦЕ!



## Пасля пералому сцягна вельмі важна захоўваць рухавасць

**Паламаць сцягно можна ў любым узросце, але 90 працэнтаў шпіталізаваных — тыя, каму за 65. Арганізм старэе, і косці страчваюць мінералы, становяцца менш гібкімі. А зніжэнне гібкасці аслабляе косці, яны робяцца ломкімі. Прычым жанчыны ў два—тры разы больш схільныя да пераломаў сцягна, бо ў іх косці хутчэй губляюць шчыльнасць. Падзенне ўзроўню эстрагену з надыходам менапаўзы паскарае гэты працэс.**

— Прамой прычынай пералому сцягна з'яўляецца нязначны выпадак або падзенне нават з невялікай вышыні, — тлумачыць **участковы ўрач-тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ксенія ПАСЛЕД.** — Галоўная ж прычына хаваецца ў такім захворванні, як астэапароз, пры якім косці не змяшчаюць неабходную колькасць кальцыю і іншых мінералаў. Страта касцявой шчыльнасці перш за ўсё адбіваецца на пазваночніку і верхняй частцы сцягна, дзе часцей за ўсё косці і ламаюцца.

Калі адсутнічаюць супрацьпаказанні, то перапом лечыцца хірургічным шляхам — гэта самы эфектыўны спосаб аднаўлення. Аднак у любым выпадку магчымыя і ўскладненні, імавернасць наступлення якіх павялічваецца з узростам. У большасці людзей, нават пасля 80 гадоў, такія пераломы поўнасцю зрастаюцца. Звычайна чым лепшы стан вашага здароўя і чым вышэй рухавасць, тым больш шанцаў на хуткае аднаўленне. Тым не менш не абысціся без дапаможніка — палачкі, хадункоў або мыліц на працягу некалькіх месяцаў. Неабходна таксама, каб увесь гэты час хтосьці дапамагаў вам па гаспадарцы.

### Прыміце меры, каб знізіць рызыку падзення

✓ Жылое памяшканне павінна быць добра асветлена. Паверхня падлогі не слізкая, пажадана прыбраць з дарогі перашкоды — шнуры, дываны, мэблю. Карыстайцеся поручнямі ў ванне, калідоры, калі падымаецеся па лесвіцы.

✓ Насіце мяккі абутак. Чым старэйшымі мы становімся, тым танчэйшы павінны быць абутак, на цвёрдай цэльнай падэшве. Пругкі спартыўны абутак можа знізіць пачуццё балансу і прывесці да падзення. Пазбягайце абутку на абцасах і сандаляў з раменьчыкамі, слізкай або клейкай падэшвы.

✓ Пазбягайце небяспечнай фізічнай нагрузкі. Напрыклад, таго, каб самастойна лазіць па лесвіцы, — прасіце дапамогі. Не падымайце цяжар.

✓ Праверце зрок — неабходна дасканала бачыць усё, што вакол вас.

✓ Пачуццё слабасці або млосці можа быць звязана з прыёмам некаторых лекаў, што таксама павялічвае імавернасць падзення, а таму пра гэта трэба памятаць і раіцца з урачом

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Горача!

# У СПЁКІ СВАЕ МІНУСЫ

**Скарыстайцеся магчымасцю пахадзіць басаною па траве — на ступнях змяшчаецца мноства кропак, якія адказваюць за работу арганізма, у тым ліку за добрую тэрмарэгуляцыю. Не піце салодкае, аддайце перавагу пітной або мінеральнай вадзе, якая адновіць водна-салявы баланс. Насіце шляпу, якая абароніць ад ультрафіялету не толькі пяшчотную скуру, але і вочы. І яшчэ некалькі слушных парад ад тэрапеўтаў.**



Калі ў памяшканні няма чым дыхаць, пакладзіце пад язык лядзяш — у вас адкрыецца другое дыханне. На ніжнім баку языка знаходзіцца кропка, якая стымулюе работу сардэчна-сасудзістай сістэмы і танізуе арганізм.

Старажытныя кітайскія ўрачы былі ўпэўнены, што найлепшы напой у спёку — зялёны чай, які валодае «халоднай прыродай». Высокая тэмпература напою прымушае арганізм пацець. Выпарэнне са скуры забірае з сабой частку цеплыні, і ў выніку мы ахалоджваемся.

Стала спякотна на дачы? Адарвіце лісце мяты, размніце ў руках і патрыце скроні сокам на працягу хвіліны — ментол дапаможа ахалодзіцца.

Немагчыма заснуць? Змачыце прасціну вадой — вільготная тканіна дапаможа ахалодзіцца і вярнуць сон.

Зрабіце зялёны суп. Натрыце агурок, парэжце зяленіва і заліце мінеральнай вадой — сілы адновяцца.

Устанавіце вентылятар унізе. Халоднае паветра цяжэйшае за гарачае, таму, калі вентылятар стаіць на падлозе, ён паднімае халаднаватае паветра ўгору, і дыхаць становіцца лягчэй.

Купіце пульверызатар, надзеньце яго на бутэльку з мінеральнай вадой і апырсквайце сябе кожныя 30 хвілін.

Насіце горны крышталь, які забірае гарачыню, але навобмацак застаецца халаднаватым.

Халаднаваты душ прыносіць палёгку ўсяго на некалькі хвілін і паграждае прастудай. А вось цёплы дапамагае натуральнай тэрмарэгуляцыі.

Карыстайцеся крэмамі на воднай аснове з УФ-абаронай.

Калі ёсць магчымасць, паспіце пасля абеду. Гэта забяспечыць запас сіл да вечара.

У спёку асабліва хутка з'яўляюцца свабодныя радыкалы, якія разбураюць сасуды і выклікаюць заўчаснае старэнне. Таму нам спатрэбіцца вітамін С — ешце па дольцы лімона, па 10 ягад чорных парэчак, якія змяшчаюць дзённую норму каштоўнага вітаміну.

Адчуваеце, што перагрэліся? Зрабіце глыбокі ўдых, пачакайце пару секундаў і выдыхніце. Паўтарыце 5 разоў.

Кладзіцеся спаць не пазней за 23.00 і прачынайцеся раней. Ранішняя прахалода дазволіць справіцца з мноствам спраў.

Не насіце нічога, што вас сціскае, каб не пагоршыць цыркуляцыю арганізма крыві і забеспячэнне арганізма кіслародам. Адна з асноўных праблем, з якой мы сутыкаемся ў спёку, дэфіцыт кіслароду.

Пры любой магчымасці плёскайцеся ў вадзе.

Асцярожна праветрывайце памяшканне, калі ў доме ёсць малыя дзеці ■

### Першая дапамога пры цеплавым і сонечным ударах

**Хворага неабходна перанесці ў халаднаватае месца або цень, пакласці з прыўзнятай галавой. Адзенне зняць, галаву і вобласць сэрца ахалодзіць, але не рэзка, даць халаднаваты напой і панюхаць нашатырны спірт.**

■ Асаблівасці захворвання

# АД ТАТУ ДА ГЕПАТЫТУ?

## Вірусны гепатыт А сустракаецца ў нас ужо надзвычай рэдка, чаго пакуль не скажаш пра В і С, якія перадаюцца значна лягчэй за ВІЧ і не толькі палавым шляхам

**Барацьба з вірусным гепатытамі застаецца актуальнай праблемай для свету. У меншай ступені, вядома, для развітых краін, у большай — для тых, дзе ўзровень жыцця вымушае жадаць лепшага. Аднак пагроза застаецца для ўсіх нас фактычна аднолькавай, бо вандроўкі па свеце — з дзелавой ці забаўляльнай мэтай — сталі справай звычайнай. Захворванне можна прывезці «з сабой».**

Сусветная арганізацыя аховы здароўя надае барацьбе з віруснымі гепатытамі такое ж значэнне, як і барацьбе са СНІДам, сухотамі да малярыяй, і звяртае ўвагу грамадскасці на неабходнасць дабіцца элімінацыі (вывядзення) вірусных гепатытаў да 2030 года. А пакуль 257 млн чалавек жывуць у свеце з вірусным гепатытам В і 71 млн — з гепатытам С. З ВІЧ, дарэчы, — каля 37 млн. Смяротнасць ад вірусных гепатытаў супастаўляльная са смяротнасцю ад сухотаў і перавышае смяротнасць ад СНІДу. Кожны дзень тысячы людзей працягваюць заражацца, таму што не ведаюць пра некаторыя рэчы або проста грэбуюць элементарнымі правіламі засцярогі. Толькі невялікая частка інфіцыраваных праходзіць тэсціраванне і лячэнне. А між тым і ў тэсціраванні, і ў лячэнні намеціўся за апошнія гады значны прарыў. Многім краінам сталі даступныя генерычныя прэпараты, таму ўвесь курс лячэння можа каштаваць ужо не больш за 200 долараў.

— Вірусныя гепатыты А і Е, якія перадаюцца фекальна-аральным шляхам, сталі для нашай краіны рэдкімі выпадкамі — менш за адзін выпадак на 100 тысяч насельніцтва, кожны пяты пры гэтым заразіўся за межамі краіны — у дзелавых і турыстычных паездках па Таджыкістане, Туркменістане, Турцыі, Егіпце і некаторых іншых краінах, — расказвае **намеснік галоўнага ўрача па эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ.** — У 1980—1990-я гады гаворка ішла пра некалькі тысяч выпадкаў віруснага гепатыту А ў год, вялікую колькасць успышак, а сёння хворых — менш за сотню. Таму што ў першую чаргу змяніўся ўзровень жыцця, палепшыліся бытавыя ўмовы, праводзяцца неабходныя санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы — бяспека водазабеспячэння, змяненне тэхналогіі ўпакоўкі харчовых прадуктаў і г. д. Аднак пра многае павінны клапаціцца і мы самі.

У першую чаргу гэта якасць пітной вады ў тых краінах, куды мы накіроўваемся (варта карыстацца бутыляванай вадой), дасканалая тэрмічная апрацоўка прадуктаў, у тым ліку морапрадуктаў, а таксама асабістая гігіена...

Такія складаныя інфекцыі, як вірусныя гепатыты В і С, перадаюцца праз кроў, сперму і вагінальную вадкасць і могуць працякаць у вельмі цяжкай форме. Дзесьці ў кожнага дзясятага дарослага і ў 50—90 працэнтаў дзяцей працэс становіцца хранічным. Апытанні інфіцыраваных і розныя даследаванні паказваюць, што галоўным чынам гепатыты В і С перадаюцца праз неабароненыя палавыя кантакты. 10 працэнтаў прыпадае на немедыцынскія маніпуляцыі, падчас якіх парушаецца цэласнасць скуры — манікюр, пірсінг, тату. Пры гэтым спецыялісты адзначаюць, што ва ўстановах, якія працуюць афіцыйна і маюць адпаведную сістэму кантролю, рызыка мінімальная. Яшчэ каля 10 працэнтаў выпадкаў звязваюцца з унутрывенным увядзеннем наркотыку. Аднак вірусы гэтыя вельмі ўстойлівыя ў навакольным асяроддзі, могуць захоўвацца на розных рэчах да шасці месяцаў, што таксама можа ўяўляць небяспеку, паколькі вядомы і бытавы шлях перадачы — найчасцей ад інфіцыраванага іншым членам сям'і. Апошнім у такіх выпадках рэкамендуецца прайсці вакцынацыю хоць бы ад віруснага гепатыту В. Гэта цалкам даступна ў дзяржаўных медустановах па месцы жыхарства, дастаткова толькі пацікавіцца. Зрабіць прышчэпку можа і любы ахвотны дарослы. А большасць тых, каму сёння да 25 гадоў, ужо абароненыя — яны атрымалі прышчэпкі пры нараджэнні. Такая практыка працягваецца і сёння. Спецыялісты не рэкамендуюць бацькам адмаўляцца ад гэтага: заражэнне ў дзіцячым узросце можа пагражаць хранічным працэсам, што ў выніку справакуе такое сур'ёзнае захворванне, як цыроз печані, а гэта — рэальная пагроза жыццю.

«З'явілася шмат новых прэпаратаў, якія валодаюць прамым супрацьвірусным дзеяннем, яны маюць большую эфектыўнасць у параўнанні з той тэрапіяй, што была дагэтуль і ўключала інтэрфероны, — тлумачыць **дацэнт кафедры інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Святлана ЛУКАШЫК.** — Такія прэпараты не працуюць як універсальныя імунамадулятары, яны ў большай ступені скіраваны на блакаду пэўных ферментаў, дзякуючы чаму іх эфектыўнасць дасягае 95—100 працэнтаў. Прэпараты прамога супрацьвіруснага дзеяння могуць прызначацца нават самым цяжкім пацыентам з цырозам печані, тым, хто рыхтуецца да трансплантацыі печані, пасля трансплантацыі... Лекі добра пераносяцца, маюць мінімум пабочных эфектаў і дазваляюць пры гэтым спыніць працэс прагрэсіравання захворвання, павялічыць выжывальнасць».

Магчымасці выкарыстання такіх лекаў прадугледжаны ў новых пратаколах па хранічных вірусных гепатытах В і С ■

# Звярок, цацка ці чалавек?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Лагатып турніру ужо прадстаўлены, ідэяй да яго стварэння стаў лозунг «Ідзі за марай», у аснову пакладзена легенда пра папараць-кветку, якая квітнее ў летнюю ноч на Івана Купалу. Афіцыйны дэвіз Гульняў: «Bright Year, Bright You» («Яркі год, яркі ты»). Руская варыяцыя лозунгу — «Время ярких побед» і беларуская — «Час яскравых перамог».



Што датычыцца талісманаў Еўрагульняў, то ў Баку-2015, на першым турніры, публіку весялілі Джэйран (газель) і Нара (гранат), яны сталі вобразамі, якія адлюстравалі гісторыю Азербайджана і яго перспектыўную будучыню. Газель Джэйран стала сімвалам грацыі, прыроднай прыгажосці, вытанчанасці і чысціні ў краіне, гранат Нара — фрукт, які любіць сонечнае свята і з'яўляецца сімвалам жыцця і энергіі.

Як правіла, талісманам спартыўных спаборніцтваў можа стаць чалавек, жывёла або казачная істота, якая адлюстроўвае асаблівасці культуры народа — гаспадара турніру — і якая сімвалізуе каштоўнасці сучаснага алімпійскага руху. Лічыцца, што місія талісмана — прынесці поспех спартсменам і падтрымаць святочную атмасферу.



Успомнім, як развівалася гісторыя талісманаў на Алімпіядах, аналагам якіх і з'яўляюцца Еўрагульні.

Самы першы талісман з'явіўся на зімовых Алімпійскіх гульнях 1968 года ў французскім Грэноблі — калабок-лыжнік Шчус. Аднак ён лічыцца неафіцыйным, бо толькі праз некалькі гадоў на сесіі Міжнароднага алімпійскага камітэта было зацверджана





паняцце «алімпійскі талісман». Таму першым афіцыйным сімвалам летніх Гульняў стала такса Вальдзі ў Мюнхене-1972, а зімовых — снегавік Алімпіямандл у Інсбруку-1976.



Талісманы адразу здабылі вялікі поспех у аматараў спорту і саміх атлетаў, іх выпускалі ў выглядзе разнастайных сувеніраў — ад значкоў да плюшавых цацак, малявалі на адзенні, посудзе, плакатах.

Арыгінальнасць ідэі з'яўляецца адным з асноўных крытэрыяў у ацэнцы талісмана, па першым часе дызайнеры ўсё часцей надавалі ім заамарфныя рысы. Летнія Гульні 1976 года ў Манрэалі (Канада) сімвалізаваў традыцыйны жыхар мясцовых лясоў бабёр Амік. У 1980 годзе сімвалам зімовых Гульняў у Лэйк-Плэсідзе (ЗША) стаў янот Роні, сімвалам



летняй Алімпіяды ў Маскве — Міша (афіцыйна — Міхаіл Патапыч Таптыгін). Многія і сёння памятаюць, як падчас цырымоніі закрыцця Алімпіяды-80 гіганцкая гумавая лялька Міхаіла



Патапыча на паветраных шарах пад песню Аляксандры Пахмутавай павольна паплыла ў маскоўскае неба. Відовішча было настолькі кранальным, што і гледачы, і ўдзельнікі Алімпіяды не маглі ўтрымацца ад слёз. Дарэчы, праз гадзіну Мішка прызямліўся на ўскраіне Масквы.

Сімвалам зімовай Алімпіяды ў Сараеве (Югаславія) у 1984 годзе было абрана ваўчаня Вучка. Паводле задумы стваральнікаў, яно сімвалізавала чалавечае жаданне «пасябраваць з жывёламі і



стаць бліжэй да прыроды». Югаслаўскі талісман прызнаны адным з самых абаяльных за ўсю гісторыю Гульняў.



Затым у алімпійскую моду ўвайшлі казачныя персанажы — напрыклад, снежны горны эльф Магік увасабляў Альбервіль (Францыя, 1992 год).



На Алімпіядзе-1994 у Ліллехамеры (Нарвегія) упершыню талісманамі сталі людзі: хлопчык і дзяўчынка Хакон і Крысцін — брат і сястра з нарвежскіх народных казак.



У 1996 годзе на летніх Гульнях у Атланце (ЗША) упершыню сімвалам стаў згенерыраваны камп'ютарам персанаж Ізі (ад фразы «What is it?» — «Што гэта такое?»).

Бліжэй да 2000-х з'явілася тэндэнцыя стварэння не аднаго, а адразу некалькіх сімвалаў Алімпійскіх гульняў. Напрыклад, у Нагана (Японія, 1998 год) талісманамі сталі чатыры белыя савяняці (Сукі, Нокі, Лекі і Цукі).






Талісманамі летніх Алімпійскіх гульняў у Сіднеі (Аўстралія, 2000 год) сталі рэдкія жывёлы кукабара (аўстралійскі зімародак-рагатуха), качканос і яхідна. Прычым кукабару назвалі Олі (у гонар Алімпіяды), качканоса — Сід (ад слова Сідней), а яхідну — Мілі (ад слова «міленіум»).




Талісманы Алімпіяды-2002 у Солт-Лэйк-Сіці (ЗША) — заяц, каёт і мядзведзь сімвалізавалі алімпійскі лозунг «Хутчэй, вышэй, мацней!».

Алімпійскія гульні 2004 года ў Афінах (Грэцыя) прадстаўлялі персанажы, створаныя на ўзор сапраўдных грэчаскіх лялек, знойдзеных пры раскопках, якія адносяцца да VII стагоддзя да нашай эры.



На летніх Гульнях-2008 у Пекіне (Кітай) талісманаў было пяць: рыбка («Бэй-Бэй»), панда («Цзін-Цзін»), тыбецкая антылопа («Хуань-Хуань»), ластаўка («Ін-Ін») , а таксама алімпійскі агонь («Ні-Ні»). Назва для талісманаў была абрана не выпадкова — аб'яднанне гэтых складоў утварае фразу «Бэйцзін хуанын ні», што ў перакладзе з кітайскай азначае: «Сардэчна запрашаем у Пекін!»



Самым вядомым беларускім спартыўным талісман пакуль з'яўляецца зубр Волат, які сімвалізаваў чэмпіянат свету па хакеі 2014 года ў Мінску. Дарэчы, ён сам і яго імя было абрана таксама з дапамогай народнага галасавання. Хто прадставіць усяму свету беларускі народ, традыцыі і культуру ў 2019 годзе залежыць ад вас.

### Тым часам

## Распрацаваць дакладныя падыходы і пралічыць дэталі

Падрыхтоўка інфраструктуры Мінска да II Еўрапейскіх гульняў 2019 года разгледжана на чарговым пасяджэнні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта

**Нарада прайшла пад старшынствам прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова. Сярод разгледжаных пытанняў — фінансаванне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы гульняў, распрацоўка сістэмы сканіравання білетаў і размяшчэнне дырэкцыі па правядзенні турніру.**

Андрэй Кабякоў праінфармаваў, што кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прапановы аргкамітэта па канцэпцыі брэнда II Еўрапейскіх гульняў, яму былі далажаны падыходы па відах спорту і асноўныя палажэнні кантракта. Таксама прэм'ер-міністр адзначыў, што неабходна выпрацаваць дакладныя падыходы да фінансавання расходаў на правядзенне гульняў. «Лішніх грошай у бюджэце няма. Выдаткі будуць толькі на самае неабходнае, таму прашу ўсё пралічваць дэталёва, абгрунтоўваць кожны рубель, шукаць іншыя рэзервы, працаваць над зніжэннем кошту абсталявання і паслуг. Да гэтых пытанняў трэба ставіцца вельмі адказна», — цытуе прэс-служба кіраўніка ўрада.

### Да тэмы:

**Аб'яўлены конкурс песні цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Конкурс на стварэнне глыбокіх па змесце і сучасных па сродках выразнасці песень для цырымоній адкрыцця і закрыцця Еўрагульняў-2019 пройдзе з 1 жніўня па 1 снежня 2017 года.**

**Песні павінны раскрываць тэмы яднання народаў, мірнага спартыўнага спаборніцтва, гасціннасці Беларусі, адлюстроўваць шчырасць і цеплыню краіны, якая прымае II Еўрапейскія гульні.**

**Удзельнікам конкурсу неабходна падаць заяўку і матэрыялы (аўдыязапіс песні, нотны запіс песні, тэкст песні на рускай, беларускай і англійскай мовах) з 1 жніўня па 1 лістапада 2017 года на паштовы або электронны адрас Маладзёжнага тэатра эстрады (220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 18а, тэл. (017) 213 19 49; 213 15 66; e-mail: teatrestrady@mail.ru).**

**Адзін канкурсант можа прадставіць не больш за дзве песні, кожная працягласцю ад 2,5 да 4 мінут, для сольнага або калектыўнага выканання. Пераможцам будуць уручаны спецыяльныя дыпломы і грашовыя прэміі памерам 100, 70 і 50 базавых велічынь.**

# ВЕЧНА МАЛАДАЯ І СПАРТЫЎНАЯ

У суботу на базе мінскага ліцэя №1 прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 100-годдзя «Звязды»




**На спартыўных пляцоўках навучальнай установы, якая размясцілася на праспекце Газеты «Звязда», суботняй раніцай сабраліся чытачы, журналісты, сябры газеты і нават тыя, хто ўпершыню пазнаёміўся з легендарнай «Звяздой». Свята пад гучнай назвай «На ўсе 100!» адкрылася невялікім экскурсам у гісторыю найстарэйшага друкаванага выдання краіны. Арганізатары падрыхтавалі сюрпрызы для ўдзельнікаў мерапрыемства ўсіх узростаў, таму на свята зазіралі як дзеці, што прыйшлі згуляць у футбол з «зоркамі» беларускага спорту, так і падпісчыкі газеты з 50-гадовым стажам.**

Запрошанымі гасцямі сталі самыя моцныя людзі краіны — рэкардсмены і чэмпіёны свету па гіравым спорце — браты Сігневічы, Вячаслаў Харанека, Андрэй Гук, Андрэй Зазерскі. Асілкі ўразілі публіку трукамі і жангліраваннем гірамі, дарэчы, пасля іх маніпуляцыі з цяжкімі прадметамі маглі паўтарыць і прысутныя, вядома, пад чуйным наглядам прафесіяналаў. Найбольш удачлівыя і спартыўныя госці свята атрымлівалі падарункі ад газеты.

А кульмінацыяй падзеі стала з'яўленне гульцоў нацыянальнай зборнай па міні-футболе, прадстаўнікоў клуба «Сталіца» — Андрэя Чурыліна, Юрыя Рабыкі і Аляксандра Альшэўскага. Футбалісты выклікалі сапраўднае захапленне ў прадстаўнікоў маладой публікі, спартсмены правялі майстар-клас для хлопчыкаў. За фінтамі, абводкамі і яшчэ не настолькі моцнымі ўдарамі сачылі аматары спорту старэйшага ўзросту, якія ў заключэнні свята змагаліся ў футбольным матчы на кубак «Звязды». Журналісты нашай газеты змагаліся за яго з выкладчыкамі ліцэя.

Чым скончыўся гэты матч, а таксама пра іншыя цікавінкі звяздоўскага свята «На ўсе 100!» мы раскажам у святочным нумары 9 жніўня.



Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Полацк-2017

# ВЯРТАЮЧЫ БЫЛУЮ СЛАВУ

## Хутка пабачыць свет новая кніга твораў, прысвечаных самаму старажытнаму гораду Беларусі

**Напярэдадні Дня беларускага пісьменства горад, які прымае свята, нібыта ажывае. Работа па падрыхтоўцы да прыёму гасцей, абмеркаванне праграмы, добраўпарадкаванне вуліц пачынаецца загадзя. Сёлета з асаблівым хваляваннем чакаюць свята людзі, для якіх Полацк — горад родны, блізкі. Стараюцца спланаваць свой працоўны графік, каб трапіць як ма га большую колькасць імпрэз, радуюцца будучым сустрэчам з землякамі і роднымі мясцінамі і, натуральна, самі рыхтуюць падарункі. Таму цалкам заканамерна, што перад святкаваннем 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і Дня беларускага пісьменства так шмат намаганняў асоб, з'яднаных лёсам з Полацкам, скіравана на тое, каб свята сталася сапраўды знакавым. Адзін з такіх творцаў — Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, пісьменнік, галоўны дырэктар міжнароднага вяшчання радыё «Беларусь», ураджэнец і ганаровы грамадзянін нашага самага старажытнага горада.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Навум Якаўлевіч, ведаю, што вы зноў выступілі ў якасці ўкладальніка кнігі, прысвечанай Полацкай зямлі, якая рыхтуецца да выхаду ў серыі «Беларусь літаратурная». Чым будзе адметны зборнік?***

— Так, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ўжо падрыхтаваны і днямі пабачыць свет зборнік «Сафійка, Полацк, родны край». І мне зноў выпаў гонар быць укладальнікам падобнага выдання. Дарэчы, менавіта кніга пра Полацк «Там, дзе вежы Сафіі» 14 гадоў таму і распачала серыю. Тады, паводле канцэпцыі, мы пад адной вокладкай сабралі творы пісьменнікаў, якія лёсам і творчасцю звязаныя з Полацкам, прадставілі, напрыклад, такіх асоб, як Валянцін Лукша, Алесь Савіцкі, Уладзімір Арлоў і іншых. Новае выданне складалася па крыху іншым прынцыпе: прапануем чытачам прозу, вершы, тэматыкай звязаныя з Полацкам, а іх аўтарамі неабавязкова выступаюць палачане. Разам з творамі Яна Баршчэўскага змешчана проза Вацлава Ластоўскага, Змітрака Бядулі, паэзія Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна і іншых. Вялікі артыкул пра полацкую гісторыю прапанаваў доктар філалагічных навук, прафесар Іван Саверчанка. Цэлы раздзел новага выдання прысвечаны скарыназнаўству і постаці нашага першадрукара. Тут падаюцца перастварэнні скарынаўскіх тэкстаў, выкананыя Алесем Разанавым, нарыс Уладзіміра Караткевіча, кніга Алега Лойкі, своеасаблівы полацкі літаратурны атлас стварыў Сяргей Панізнік.Частка зборніка «Сафійка, Полацк, родны край» аддадзена творам сённяшніх літаратараў, якія жывуць у Полацку. Гэта сябры літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне», дарэчы, аднаго з найстарэйшых у нашай краіне.

**«Кніга «Сафійка, Полацк, родны край» зацікавіць не толькі тых чытачоў, якія жывуць у Полацку, але і ўсіх беларусаў. Далёка не кожнаму вядомыя многія факты, звязаныя з культурным жыццём і гісторыяй горада, тым, якое месца і значэнне ён мае ў літаратуры».**

***— Падаецца, што гэтая кніга мае досыць вузкае кола чытачоў — найперш саміх палачан ці тых, хто ўжо захоплены самым старажытным горадам краіны...***

— Гэта не так. Думаю, кніга зацікавіць не толькі тых чытачоў, якія жывуць у Полацку, але і ўсіх беларусаў. Далёка не кожнаму вядомыя многія факты, звязаныя з культурным жыццём і гісторыяй горада, тым, якое месца і значэнне ён мае ў літаратуры. Канешне, 500-годдзе нашага кнігадрукавання — важная нагода, каб пра гэта расказаць. Але не толькі выдавецкі праект знаёміць з выбітнымі землякамі. З Полацкам звязана жыццё многіх цікавых людзей, яны зрабілі вельмі шмат для горада і гэтых мясцін. Ды зноў жа не пра ўсіх асоб вядома шырокаму колу. Такім меркаваннем я кіраваўся, калі задумаў цыкл замалёвак «Палачане». Матэрыялы друкуюцца ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Мне ўдалося коратка расказаць пра такіх цікавых палачан, як краязнаўцы Іван Дэйніс, Мікалай Маніс, былы дырэктар Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка Мікалай Ільніцкі, былы рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Эрнст Бабенка, аўтар знакамітай песні «Ручнікі», вядомы кампазітар Мікалай Пятрэнка.

***— Магчыма, парадуеце землякоў і сваёй новай кнігай паэзіі?***

— Сапраўды, рыхтуецца зборнік маіх выбраных вершаў. Выданне таксама павінна стаць пэўным падарункам для роднага горада. Будзе і яшчэ адзін кніжны сюрпрыз. Год таму мы разам з пісьменнікам, журналістам Зіновіем Прыгодзічам зладзілі вандроўку па Полацку і Наваполацку. Вынікам яе сталася яго кніга нарысаў. Першыя з гэтых твораў будуць надрукаваныя ў часопісе «Полымя», яны пабачаць свет і асобным выданнем. У праграме святкавання Дня беларускага пісьменства — многа прэзентацый, адметных імпрэз, якія ладзіць Міністэрства інфармацыі сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Гэта конкурс «Жывая класіка», міжнародны круглы стол, падчас якога будзе абмяркоўвацца не толькі ўклад Францыска Скарыны ў агульную кніжную культуру, але і многія аспекты, звязаныя з культурнай інтэграцыяй, гуманітарнымі пытаннямі, што хвалююць творцаў. Безумоўна, важнай падзеяй у літаратурным жыцці Полаччыны станецца ўручэнне мясцовым аўтарам прэміі імя Алеся Савіцкага, ганаровага грамадзяніна горада. Цырымонія пройдзе напярэдадні Дня беларускага пісьменства. Рашэнне аб заснаванні гэтай узнагароды было прынята два гады таму падчас удзелу літаратараў у «Полацкіх чытаннях». Упершыню прэмія была ўручана падчас адкрыцця памятнай дошкі на адной з бібліятэк горада, тады ж гэтай установе было нададзена імя Алеся Савіцкага. Прэмію атрымаў Віктар Карасёў, хто стане лаўрэатам сёлета — пакуль загадка для ўсіх.

***— Здаецца, пра Полацк мы і так ведаем досыць шмат — са школьных урокаў гісторыі, шматлікіх публікацый у СМІ, літаратурных твораў, навуковых даследаванняў. Ці варта яшчэ раз нагадваць шырокай грамадскасці пра яго мінуўшчыну?***

— Гораду трэба такое шырокае свята. Гэта зараз у школах праходзяць урокі радзімазнаўства, падчас якіх вучні даведваюцца пра гісторыю родных мясцін і знакавыя постаці, звязаныя з імі. У час майго дзяцінства, юнацтва такіх заняткаў, ведаю, уяўленняў не хапала. Думаю, што гэта толькі пачатак справы па вяртанні былой славы Полацку. На маю думку, горад заслугоўвае яркага вобразу, каб і яго жыхары, і беларусы ў цэлым маглі ганарыцца яго мінуўшчынай і сучаснасцю. Гаворка ідзе не толькі пра выбітных гістарычных дзеячаў, але і пра нашых сучаснікаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

■ Во даюць!

# З XXI стагоддзя — у эпоху вікінгаў

## Студэнты гістфака БДУ знайшлі артэфакты эпохі вікінгаў

**Размова ідзе пра тры мужчынскія ўпрыгожванні вікінгаў — «молаты Тора». Артэфакты былі знойдзены ў ходзе экспедыцыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў археалагічным комплексе Кардон у Шумілінскім раёне. Яны датуюцца IX—X стагоддзямі нашай эры.**



У экспедыцыі прынялі ўдзел 16 першакурснікаў гістарычнага факультэта БДУ. Кіраўніком археалагічнай практыкі выступіў загадчык навучальнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Віталь Сідаровіч. Па яго словах, раскопкі на гэтым месцы вядуцца паралельна нядаўна. У Беларусі яшчэ не сустракалі «молатаў Тора», якія б цалкам захаваліся. Такія амулеты належалі радавым воінам-вікінгам, бо зроблены яны не з дарагога металу, а з жалеза. Такімі моднымі для таго часу атрыбутамі вікінгі супрацьпастаўлялі сябе хрысціянам. «Мяркую, археолагам у наступныя 100—150 гадоў на месцы гэтага паселішча работы яшчэ хопіць», — падкрэсліў Віталь Сідаровіч.

Экспедыцыя ў Шумілінскі раён была арганізавана другі раз. Археалагічны помнік «эпохі вікінгаў» увайшоў у топ-10 навуковых адкрыццяў за 2016 год па версіі Нацыянальнай акадэміі навук.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

■ За падзеяй

# НА СПАТКАННЕ ДА МАКСІМА




## 40 гадоў таму фальварак Ракуцёўшчына стаў адметным месцам на літаратурнай карце Беларусі

Гэтыя маляўнічыя мясціны на Маладзечаншчыне нездарма прываблівацць сваёй паэтычнасцю і неймавернай чароўнасцю вось ужо не адно пакаленне беларускіх творцаў. У Ракуцёўшчыне, дзе сёння знаходзіцца філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, у 1911 годзе правёў лета паэт. Фальварак, што належаў Вацлаву Лычкоўскаму, дзядзьку Антона і Івана Луцкевічаў, стаўся для яго крыніцай натхнення, новых уражанняў, а час, праведзены тут у сям'і шляхціца, — магчымасцю сустрэцца з роднай зямлёй, пагутарыць з беларусамі і палюбавацца прыродай.



Тут, на Маладзечаншчыне, Багдановічу добра пісалася, здаецца, што і сёння, у аднаўленым доміку арандатара, які паўтарае той будынак, што паэт наймаў на сядзібе, можна адчуць неймаверную атмасферу творчага пошуку. Музеефікацыя гэтых мясцін пачалася ў 1977 годзе, калі на ўспамін аб гасцяванні паэта ў фальварку было ўстаноўлена два валуны. Праз чатыры гады непадалёк вырас «Максімаў сад», пасаджаны паэтамі, а ў 1994 годзе адчыніў дзверы для наведвальнікаў філіял Літаратурнага музея паэта «Фальварак Ракуцёўшчына».

Максімавы мясціны не могуць не зачароўваць. Тут шумяць дрэвы, бруіцца крынічка, каля якой любіў бавіць час паэт, а самі будынкі музея нібыта пераносяць нас у часе на стагоддзе назад. Цалкам лагічна, што традыцыйным стала і літаратурна-музычнае свята «Ракуцёўскае лета», якое штогод ладзіцца ў фальварку. Яно і гэтымі днямі прайшло на Маладзечаншчыне. Сюды традыцыйна завітваюць паэты, музыканты з розных куткоў Беларусі, гучаць беларускія песні, вершы. І гэта неабавязкова творы Максіма ці прысвячэнні яму. Па завядзёнцы натхненне тут шукаюць і мастакі — непадалёк ад цэнтральнай сцэны святкавання разгортваецца пляцоўка для пленэру.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by
**Фота Кастуся ДРОБАВА**



# «УСЁ РАСПІСАНА НАПЕРАД...»

**У Цэнтра бяспекі МНС, што нядаўна адкрыўся ў Лідзе, вельмі шчыльны графік работы ў час летніх канікулаў.**

Новы аб'ект адкрыўся 1 чэрвеня. За гэты час тут пабывала каля дзвюх тысяч наведвальнікаў, у асноўным дзеці, якіх прывозяць групамі з аздараўленчых летнікаў. Колькасць ахвотных пабываць тут толькі расце, **паведамляе інспектар прапаганды Лідскага аддзялення МНС Вадзім БАРТЭЛЬ**. Ужо прынята каля ста груп. Гэта сапраўдная навінка для рэгіёна, ды і ў цэлым па краіне такіх устаноў толькі тры.

У Лідзе пад Цэнтр бяспекі прыстасавалі пустуючы аб'ект, але напоўнілі яго сучасным інтэрактыўным абсталяваннем. У ходзе экскурсіі можна праверыць уласныя веды па правілах бяспекі і атрымаць навыкі выратавання сябе і сваіх блізкіх. Інспектар з дапамогай манекена дэманструе дапамогу чалавеку, які папярхнуўся ежай.

— Ні ў якім разе не трэба біць чалавека па спіне, бо кавалачак ежы можа пайсці яшчэ глыбей, — папярэджвае Вадзім Бартэль. — Спачатку трэба накіраваць яго на тое, каб ён пакашляў. Калі гэта не дапамагло і чалавек пасінеў, трэба абхапіць яго ззаду дзвюма рукамі за сцёгны, нахіліць уперад і зрабіць некалькі рэзкіх рыўкоў, — кавалачак ежы павінен выскачыць.

У Цэнтры каля дзясятка розных пакояў, дзе можна даведацца, як выклікаць службу выратавання, патушыць агонь, выйсці з задымленага пакоя, аказаць дапамогу пры няшчасных выпадках і іншыя рэчы.



Зусім нядаўна пачаў функцыянаваць пакой памылак. Дзякуючы камп'ютарным тэхналогіям змадэляваны выпадкі ўзнікнення надзвычайных сітуацый. Пры навядзенні планшэта на вызначаныя дэкарацыі можна ўбачыць, што адбудзецца пры парушэнні правілаў пажарнай бяспекі, эксплуатацыі газавага абсталявання, электрычных прыбораў, пячнога ацяплення, неасцярожнасці пры курэнні.

У будучым плануецца абсталяваць Цэнтр бяспекі новымі трэнажорамі, на якіх будуць адпрацоўваць паводзіны падчас навальніцы, пры паражэнні токам, антыкрымінальныя выпадкі, інтэрнэт-бяспека.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

## ■ Класныя навіны

# ЛЕТА З КАРЫСЦЮ

**Новы адукацыйны праект для школьнікаў «IT-лагер» запускаюць Міністэрства адукацыі і мабільны апаратар МТС.**

У рамках сумеснай ініцыятывы 7 жніўня на базе дзіцячага аздараўленчага летніка «На ростанях» стартуюць IT-курсы «Праграмаванне гульняў на мове Scratch». Партнёрам праекта выступіў адукацыйны цэнтр Парка высокіх тэхналогій.

Праграма навучання распрацавана работнікамі адукацыйнага цэнтра ПВТ і зацверджана Міністэрствам адукацыі. Падчас навучальнага курса школьнікі пазнаёмяцца з камп'ютарнай анімацыяй і графікай, навучацца працаваць у камандзе, думаць аналітычна і знаходзіць рашэнні няпростых задач. Праект разлічаны на дзяцей да 14 гадоў. Заняткі ў «IT-лагеры» будуць бясплатныя.

— Міністэрства адукацыі ўдзяляе асаблівую ўвагу лічбавай трансфармацыі галіны. Адна з важных задач, якую мы ставім перад сабой сёння, — навучыць дзіця адаптавацца да дынамічнага развіцця тэхналогій, — тлумачыць **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Павел ЛІС.** — Праграма навучання складзена такім чынам, каб вучні маглі раскрыць свой патэнцыял і ўвасобіць ідэі ў канкрэтных праектах.

Праводзіць заняткі для школьнікаў будуць супрацоўнікі адукацыйнага цэнтра ПВТ — спецыялісты, у якіх ужо ёсць вопыт работы з дзецьмі. У госці да дзяцей і падлеткаў прыйдуць са сваімі майстар-класамі і прадстаўнікі беларускіх геймстудый. У фінале школьнікі прадставяць журы і бацькам свае ўласныя праекты і атрымаюць пасведчанні аб заканчэнні курса.

Адукацыйны праект для школьнікаў «Праграмаванне гульняў на мове Scratch» рэалізуецца кампаніяй МТС і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у рамках заключанага ў чэрвені бягучага года пагаднення аб супрацоўніцтве.

— Мы працягваем разам рэалізоўваць праекты, якія дапамагаюць правільна выкарыстоўваць тэхналогіі ў жыцці і ў навучальным працэсе. «IT-лагер» — гэта пілотны праект. Такія ж урокі праграмавання для школьнікаў мы плануем арганізоўваць і далей. Мэта ініцыятывы — не проста прапанаваць дзецям новыя веды, а навучыць іх думаць творча, — пракаментаваў падзею **кіраўнік камерцыйнага дэпартамента МТС Яўген БРАНЦАЎ**.

## Што такое Scratch?

Гэта асяроддзе праграмавання для навучання школьнікаў малодшых і сярэдніх класаў. Яно дазваляе дзецям ствараць уласныя аніміраваныя і інтэрактыўныя гісторыі, прэзентацыі, мадэлі і гульні. Кожны дзень Scratch выкарыстоўваюць у 30 тысячах адукацыйных праектаў па ўсім свеце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

Дэпартамент па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

ИЗМЕНЕНИЯ
в Решение о тридцать седьмом выпуске облигаций Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис», утвержденное Решением директора ОДО «НП-Сервис» 20.03.2017 приказ №54/1 ОД

В части второй пункта 15 цифры «3012000066531» заменить словом «BY93OLMP30120000665310000840», слова «код 742» заменить словами «код OLMPBY2X».

Директор общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» Д. Л. Гирей

Директор общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» В. С. Санкович

УНП 100080849

Дэпартамент па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии облигаций тридцать седьмого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (ОДО «НП-Сервис»), утвержденное Решением директора ОДО «НП-Сервис» 20.03.2017 приказ №54/1 ОД

В части второй пункта 1.4 цифры «3012000066531» заменить словом «BY93OLMP30120000665310000840», слова «код 742» заменить словами «код OLMPBY2X».

Директор общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» Д. Л. Гирей

Директор общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» В. С. Санкович

УНП 100080849

Дэпартамент па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

ИЗМЕНЕНИЯ
в Решение о тридцать девятом выпуске облигаций Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис», утвержденное Решением директора ОДО «НП-Сервис» 20.03.2017 приказ №54/1 ОД

В части второй пункта 15 цифры «3012000066531» заменить словом «BY07OLMP30120000665310000933», слова «код 742» заменить словами «код OLMPBY2X».

Директор общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» Д. Л. Гирей

Директор общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» В. С. Санкович

УНП 100080849

Дэпартамент па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии облигаций тридцать девятого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (ОДО «НП-Сервис»), утвержденный Решением директора ОДО «НП-Сервис» 20.03.2017 приказ №54/1 ОД

В части второй пункта 1.4 цифры «3012000066531» заменить словом «BY07OLMP30120000665310000933», слова «код 742» заменить словами «код OLMPBY2X».

Директор общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» Д. Л. Гирей

Директор общества с ограниченной ответственностью «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» В. С. Санкович

УНП 100080849

## Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО«Барановичидрев» на третьих повторных торгах 11 августа 2017 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А. М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости:

Конт. тел.: 8-029-6332490 vel.; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124;

Emal: mischuk_am@mail

Победитель аукциона оплачивает стоимость Лота №2 в течение 30 дней с момента проведения аукциона.

Цена Лота №2 снижена на 30% от цены установленной независимым оценщиком.

ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА

**Комплекс зданий и сооружений, объединенных в ЛОТ №2:**

**1)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112496, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, общей площадью 13 623,3 м. кв, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех оконных блоков.

Свидетельство о государственной регистрации от 02.09.2016 года за номером 110/530-17784, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 394 100 рублей, без НДС.**

**2**) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775625,расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/1, общей площадью 2 129,6 кв. м, целевое назначение – административное помещение, наименование – административное помещение.

Свидетельство о государственной регистрации от 29.04.2017 года за номером 110/1756-206, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 230 300 рублей, без НДС.**

Капитальные строения по п.п. 1–2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003540, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок 3/1, общей площадью 3 0596 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 26.01.2017 года за номером 110/530-18312, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**3)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112253, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/4, общей площадью 452,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – арочный склад.

**СТОИМОСТЬ: 28 210 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17637, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**4**) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112254, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/3, общей площадью 1 130,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание прирельсового склада.

**СТОИМОСТЬ: 63 630 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17638, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

Капитальные строения по п.п. 3–4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003525, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок 3/3, общей площадью 0 7480 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17948, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**5)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-111817, расположенное по адресу: Брестская обл. г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 530 9 м кв., назначение – здание неустановленного назначения, наименование – склад арочный.

**СТОИМОСТЬ: 33 110 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 23.03.2016 года за номером 110/1243-2640, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003524,зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 0,4697 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17947, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестское агентство по регистрации и земельному кадастру».

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №2 – 749 350 рублей, без НДС.**

**Составные части к ЛОТУ №2:**

- часть забора-1040,4 м/п.
- асфальтовое покрытие – 2 234 кв. м;
- помещение сторожа;
- станция пожаротушения;
- ворота;

Оплачиваются победителем торгов (участником) по отдельному договору купли-продажи.

Сумма задатка: 10% от начальной цены Лота №2 в рублях РБ.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с BY68BPSB30121226161389330000; BIC-BPSBBY2X в ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Минск

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению. Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТУ №2 в срок до 14 часов 00 минут 08.08.2017 года организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу: 225410, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

С условиями аукциона также можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 01.08.2017 года.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ
ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» А. МИЩУК

УНП 200299909

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 04.09.2017 размер процентной ставки по договорам банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенным на условиях, утвержденных решением Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» 04.04.2006, протокол №36 составит 0,1% годовых.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 04.09.2017 размер процентной ставки по договорам банковского вклада (депозита) физических лиц до востребования в белорусских рублях составит 0,1% годовых.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

■ Простая мова

# ДОБРЫ ДОЖДЖ

**Надвор'е зноў (і які ўжо раз?!) падвяло сіноптыкаў: абяцалі... Зрэшты, яно ж без розніцы, што, канкрэтна, яны абяцалі, і што сапраўды было? Збітыя з панталыку (не ўпершыню, прывычныя) мы, што называецца, праехалі — перажылі. А вось наступнікаў... шкада. Нехта з іх праз сто гадоў разгорне, напрыклад, падшыўку «Звязды» (а-у, спадарок, прывітаннечка!..), прачытае прагноз на якое-небудзь (умоўна) 9 жніўня гэтага года і будзе думаць, што ў краі было тады сонечна, дваццаць градусаў цяпла, з кароткім дажджом.**

## Каб ведаць

Бульбы на рынку да халеры было. Але ж іншыя гандляры маўчалі... Гэты — заліваўся салаўём: казаў, што ягоную — хіба салькай пасыпаць, а так — «без нічога з'ясі», можа, нават... з відэльцам.

Паверылі і нават праверылі: гэта значыць, купілі, з тыдзень елі (бульба, як бульба, трэба сказаць — нічога цікавага), калі б тры штучкі, з расткамі, не ўкінулі ў зямлю...

Яна тады — вялікая, добра прагрэтая — самай першай узышла... І сантыметраў на дзесяць ад зямлі адскочыла, а вось потым — стала «тармазіць» і зусім спынілася.

Знаўцы кажуць, што так бывае — з хворым насеннем.

Але ж знешне бульба выглядала здаровай: людзі з ахвотай яе куплялі, елі, і, магчыма, нават садзілі...

Яшчэ і для таго, відаць, каб пераканацца, што ўзростаў у чалавека насамрэч тры: калі ён садзіць бульбу, калі не садзіць і зноўку садзіць, бо трэба ж ведаць, чым жывішся сам, чым корміш сваю сям'ю...

## Урок

У дачніц-вясковак вясною чэйндж, тобок абмен — расадай, кустамі, кветкамі: вакол толькі і гутаркі, хто каму занёс памідораў, а хто гарбузоў, хто хосты адкапаў, а хто бадану...

Прарабіха, хоць і рэдкая скупянда, але ж таксама «з рыдлёўкай ходзіць»: ружа ў яе ампельная — на ўвесь плот у кветніку, а ўжо як зацвіце... Многія просяць... І гаспадыня, бывае, некаму дае — адкопвае новы адростак, кажа:

— Не глядзі, што малы, — разрасцецца.

Шмат хто на гэта спадзяваўся, але...

Мусіць, праўду кажуць, што ў скупога не бяры нічога — і не павядзецца, і абавязаным будзеш.

## Ёсць справядлівасць?

Новыя навіны — чарговы суд і такі ж прысуд: за хабар у асабліва буйных памерах восем гадоў з канфіскацыяй далі... Каму?

Не так важныя прозвішча ды пасада. Важна, што гэта — вялікай ганьбай і горам для бацькоў, якія (да бабкі не хадзі!) ганарыліся сынам-начальнікам, для дзяцей, якія фарсілі бацькам... Што, вядома ж, бядой для яго самога. Прычым — беспатрэбнай, якой мог бы пазбегнуць... Калі б хоць зрэдку думаў — яшчэ і аб тым, што піць можна не толькі каву з сакратаркай, у сваім кабінеце, але і чыфір — на пяньку, у лесе.

## Прыклад

Горад. Прыпынак. Сабака — відаць, бяздомнік, але не жабрак. Ва ўсякім разе не прынюхваецца да нейчых сумак, проста падыходзіць да іх гаспадынь і, зірнуўшы ў вочы, садзіцца побач, чакае: раптам нешта абломіцца? Не? Нічога? Тады ён пойдзе далей.

Худы, бядак — скура ды косці... Мусіць, галодны, а ў сумцы — толькі цукерка.

Нейкае дзяўчо багацейшае: дастае празрыстую каробачку з зялёнай салатай і дзвюма сардэлькамі, адну асцярожна кладзе перад сабакам. Той нюхае, але есці — нават не думае: падымае галаву (не тое з падзякай, не тое з пытаннем «Гэта — усё?») і толькі потым, зразумеўшы, што дабаўкі не будзе, бярэ зубамі пачастунак і некуды нясе.

— Мусіць, адзін хоча з'есці, каб ніхто не бачыў, — разгублена ўсміхаецца дзяўчына.

— А можа, якой сяброўцы панёс?.. Ці дзецям?

У любым выпадку гэта варта павагі, хоць бы таму, што не кожны з мужчын, не кожны з людзей здольны на нешта падобнае.

## На раздарожжы, перад выбарам

...З усіх краёў, дзе мелі шчасце пабыць, прывозілі сувеніры. Найчасцей — фотаальбомы і магнікі, нешта з прысмакаў, з мілай кухоннай драбязы, з вырабаў мясцовых рамеснікаў — для сябе, для радні і сяброў...

У Бухарэсце (нам, беларусам, пра гэта можна казаць) усе цэннікі на румынскай мове. Яна ж — мова карэннага насельніцтва — гучала на вуліцах і, само сабой, з вуснаў прадаўцоў. Нават больш за тое ці не кожны з іх, запакоўваючы свой тавар, абавязкова перавязваў яго сіне-жоўта-чырвонай стужачкай — пад колер нацыянальнага сцяга, што для ўсіх турыстаў было сведчаннем — тут ёсць народ, які любіць сваё, спаконвечнае.

...У нас яно таксама, як быццам, ёсць, але, скажам так, у двух варыянтах. І з імі, як двума крэсламі: пакуль выбераш на якое сесці, — сташ...

## Проста секс?

Кватэра — хай невялічкая, хай на самым верхнім паверсе і ў доме на ўскрайку — здавалася Каці раем, бо гэта — па-другое — свая, уласная (не інтэрнат, не пакой у здымнай...), а па-першае, жыла яна тут не адна: быў каханы, быў (праўда, пад сэрцам пакуль) іх першынец! Для яго, маленькага, яны з мужам абсталёўвалі дом, выбіралі столік для спавівання, прыгожы вазок і ложачак, марылі, як разам будуць купаць, як пойдуць гуляць...

З гэтым вось — па ўсім выглядала — узнікнуць праблемы, бо раён зусім новы, дамоў — дай божа, а дрэў — вобмаль ды і тыя маленькія. Адпаведна — ні ценю табе, ні якой прыгажосці...

Каці вельмі бракавала яе, бракавала настолькі, што хадзіла шукаць — наразала кругі вакол дальніх дамоў (найчасцей адна, бо муж пазніўся з працы), вывучала маршруты аўтобусаў: прыкідвала, напрыклад, куды яны з дзіцем (калі не пампрэ ў родах) змогуць пайсці-паехаць, дзе прыпыніцца, каб маленькі паспаў, пабыў «на прыродзе». Для яго, у парку, яна шукала найлепшую лавачку, а знайшла...

Спачатку і здалёк яшчэ ўбачыла машыну — акурат, як мужаву, а потым і... яго — з нейкай дзеўкай.

Думала спярша наблізіцца, — ногі не панеслі, пасачыць — таксама не змагла: Заплакала, пабегла прэч.

Але ж потым уявіла, як вечарам муж прыйдзе дамоў, як яна яму скажа...

А што — канкрэтна? З чаго пачне?

Хоць-нехаць вярнулася назад — парачку зняла на мабільнік, каб вечарам паказаць тыя фоткі і спытаць у мужа:

— Што гэта?

Той, відавочна, пытанняў не чакаў — разгубіўся, пачырванеў, але ж вініцца не стаў. Сказаў:

— Ну зусім не тое, што ты падумала! Гэта не здрада, не... Ты — мая жонка, вы — мая сям'я. А там — проста секс і болей нічога...

Для яго, магчыма, і сапраўды — нічога.

Для яе — якраз наадварот: канец свету, каханню, канец — адназначна — сумеснаму жыццю.

## Без бацькі?

...Адзін пасажыр у ліфце ўжо быў, мы — забеглі следам і адразу ж паехалі — не сказаць, каб далёка, але спадарожніка разгледзець паспелі: малады, з твару сімпатычны, а ўжо размаляваны... Усё цела ў так званых татушках: шыя — аж сіняя ад нейкіх клетачак ды лічбаў, рукі — ад нейкіх звяроў... Мода — за ёю карціць пагнацца. І паспрабуй тады некага спыні... А зрэшты...

Дзяцюк адзін расказваў, як некалі ў сваё 16 пірсінг зрабіў — заявіўся дахаты з колцам у вуху. Думаў, што маці засварыцца, бацька — каб што лепшае — дзяжку з портак дастане, а тыя ні слоўца яму — быццам не заўважылі. Ён спакойна заснуў.

Раніцай прачнуўся, — на тумбачцы падарунак стаіць: ладная такая каробка з ружовым бантам. А ў ёй — чаго толькі няма: лак для пазногцяў-валасоў, заколкі, розныя пацеркі, пудра-памада, цені для век... І запісачка на дне: «Майму сыночку, красаве і лапачцы. Цалую. Тата».

«Прачытаў я гэта, — успамінаў дзяцюк, — завушніцу з вуха выцягнуў і ніякіх эксперыментаў больш не рабіў. Аднаго хапіла».

Яму... А іншым?

## Героі нашага часу

Горад. Прыпынак. Голас:

— Вы не скажаце, як прайсці на вуліцу Даўмана?

Пытаюць гэта не ў нас — у нейкага дзядзькі, што стаіць паблізу. Ён старанна моршчыць лоб (трэба разумець, думае?), азіраецца наўкол і праз паўзу пачынае тлумачыць, што гэта вуліца — каля плошчы Незалежнасці (?), што дабрацца туды можна на метро...

Жанчыны ўважліва слухаюць і стараюцца запомніць, хоць гэта ім — зусім не патрэбна, бо дзядзька яўна блытае: там, каля плошчы Незалежнасці, знаходзіцца вуліца Берсана, а Даўмана...

Расказалі жанчынам, дзе, патлумачылі, як даехаць... І ў чарговы раз пашкадавалі, што няма ў сталіцы вуліц Быкава, Адамовіча, Караткевіча ды іншых, якіх ні з кім не зблытаеш — пакуль.

## Добры...

Дождж абяцалі на сераду, потым, з навальніцай, на чацвер. «Калі ён і заўтра не пойдзе, — уздыхалі суседзі-дачнікі, — будзем паліваць гароды».

Але ж назаўтра была пятніца, дзень, калі яны звычайна хадзілі ў лес, бо ў суботу з нядзеляй там рабіць няма чаго — людзей, як дрэў: што не падымуць, стопчуць... А вось напярэдадні яшчэ можна нешта знайсці, нешта падняць — і з грыбоў, і з ягад.

Не сказаць, каб у лесе іх шмат было, але ж слабейшыя з дачнікаў «нападымаліся», а потым, пакуль дапаўзлі дамоў, пакуль спарадкавалі...

На паліў, карацей, сіл не засталося — адлажылі...

І правільна зрабілі, бо ў ноч на суботу дождж такі быў — гусценькі, спорны, а галоўнае добры, інтэлігентны — ціхенька прыйшоў і ціхенька «пайшоў»: нікому, ні ў чым не зашкодзіў.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***P.S.*** *З таго, што пішам мы, журналісты, рэдка складаюцца кніжкі, калі складаюцца, то не заўжды выходзяць, калі выходзяць...*

*Лёс іх, вядома ж, розны. Ва ўсякім разе зборнік вось такіх абразкоў (каля тысячы штук) «Каб сказаць... І пачулі» чакае пакупнікоў у сталічнай «Акадэмкнізе». У іншых кнігарнях, магчыма, таксама?*

■

## «Звяздоўскі» падарунак да юбілею Ігната Дамейкі

**Пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь пабачыла свет кніга пра нашага славутага суайчынніка — Ігната Дамейку.**




Так склалася, што здабыткамі сваімі вучоны і асветнік Ігнат Дамейка (1802—1889) у большай ступені ўславіў іншыя краіны. Найперш — Чылі, дзе ён адбыўся як геолаг, географ, арганізатар універсітэцкай навукі. 17 гадоў урадзенец Беларусі (з вёскі Вялікая Мядзвядка, што на Гродзеншчыне) працаваў рэктарам універсітэта ў Сант'яга-дэ-Чылі. Здзейсніўшы нямала адкрыццяў, якія паспрыялі развіццю народнай гаспадаркі далёкай ад Беларусі краіны, напісаўшы нямала падручнікаў, навуковых манаграфій, Ігнат Дамейка пакінуў пасля сябе вялікую сям'ю. І цяпер нашчадкі славутага беларуса жывуць ва ўсіх куточках планеты. Сям'я прамых родзічаў вучонага налічвае каля 200 чалавек. У знак 215-й гадавіны з дня нараджэння І. Дамейкі Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і па замове Міністэрства замежных спраў выпусціў унікальны фаліянт — кнігу праўнучкі вучонага аўстралійскай пісьменніцы Пас Дамейка Ле-Пласа «Ігнат Дамейка: з Мядзвядкі — у Сант'яга-дэ-Чылі».

Выданне пабачыла свет у серыі «Адрасы Беларусі ў свеце». Дакументальны аповед пра нашага суродзіча створаны па матывах яго багатых на фактаграфічны матэрыял дзённікаў і пісьмаў, якія І. Дамейка адрасаваў сваім сябрам, калегам у розныя гады жыцця. Выданне ўражвае колькасцю цікавых архіўных здымкаў, іншых ілюстрацый. Можна смела сцвярджаць, што зараз мы маем сапраўдную біяграфію Ігната Дамейкі. Некаторы час назад невялікая кніга пра славутага суайчынніка выйшла ў серыі «Нашы славутыя землякі» мінскага выдавецтва «Тэхналогія».

Аповед аўстралійскай пісьменніцы, праўнучкі І. Дамейкі, — ужо другая кніга ў серыі «Адрасы Беларусі ў свеце». Першая выйшла летась і была прысвечана адрасам Расіі, дзе *здзейсніліся лёсы* нашых землякоў у розныя часіны. Застаецца заўважыць, што рыхтуецца новая кніга гэтай серыі — і яна будзе прысвечана беларускім адрасам ва Украіне. Праз яе чытач даведаецца шмат цікавага пра біяграфіі ўраджэнцаў Беларусі, якія пакінулі след у навуцы, народнагаспадарчым, культурным жыцці суседняй дзяржавы. Разам з аўтарамі кнігі можна будзе прайсці гарадскімі вуліцамі Кіева, Львова, Харкава, сцежкамі Івана-Франкоўшчыны, Ровеншчыны, разам з беларусамі, ураджэнцамі Беларусі пабываць у іншых мясцінах Украіны.

**Сяргей ШЫЧКО.**
*shychko@zviazda.by*

**ЗВЯЗДА Падарожжа праз 100-годдзе**

# Як «Звязда» пісала гісторыю (1976—1986)

**1980-я адзначыліся ў жыцці краіны пачаткам антыалкагольнай кампаніі і новым палітычным курсам на перабудову, прыняццем новай Канстытуцыі БССР і трагічнай гібеллю Пятра Машэрава, будаўніцтвам Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» і адкрыццём першай чаргі метрапалітэна, 15 залатымі медалямі нашых спартсменаў на Алімпіядзе-80 і рэкордна доўгім палётам касманаўта Уладзіміра Кавалёнка, міжнародным «Маршам міру» праз Стакгольм, Мінск і Маскву... А яшчэ ўвядзеннем абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў у Афганістан (за няпоўныя 10 гадоў ваеннага канфлікту загінулі тысячы савецкіх салдат, у тым ліку больш як 770 ураджэнцаў Беларусі) і найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофай XX стагоддзя — аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, наступствы якой свет будзе адчуваць яшчэ дзясяткі гадоў. Як пра гэта пісала «Звязда»?**

Газетныя публікацыі 1980-х сведчаць, як усё больш прэтэнзій прад'яўляюць адзін да аднаго Савецкі Саюз і ЗША. Градус «халоднай вайны» адчуваецца ўжо ў гнеўных патрабаваннях да прэзідэнта ЗША спыніць агрэсію на Блізкім Усходзе, а таксама ў з'едлівых загалоўках палітаглядаў: «Пра так званы свабодны свет», «Рэйгану не падабаецца слова «рэйганоміка», «Аб умяшанні ЗША ва ўнутраныя справы іншых краін», «Прапагандысцкая атрута», «НАТА — блок агрэсіі», «Антыкамуністычная істэрыя» і г.д. На гэтым фоне асаблівая ўвага ўдзяляецца «Маршу міру» 1982 года, удзельнікі якога з Даніі, Нарвегіі, Швецыі і Фінляндыі з заклікамі спыніць гонку ўзбраенняў пабывалі ў СССР, у тым ліку некалькі дзён правялі і ў Мінску.

З 1985 года асноўныя тэмы пакрысе мяняюцца, паколькі апошні генсек ЦК КПСС Міхаіл Гарбачоў абвясціў новы курс на паскарэнне і інтэнсіфікацыю прамысловасці, укараненне навукова-тэхнічнага прагрэсу, антыалкагольную кампанію, барацьбу з непрацоўнымі даходамі і г.д. Так, у 1986 годзе «Звязда» заклікае «Актыўней усталёўваць цвярозасць» — барацьбой з п'янствам займалася цэлая рэспубліканская камісія. «Не зжыта п'янства сярод навучэнцаў устаноў прафтэхадукацыі, інжынерна-педагагічнага персаналу, — адзначае газета. — Не ліквідаваны фармалізм у арганізацыі пазакласных мерапрыемстваў, няма належнай грамадска карыснай занятасці навучэнцаў у перыяд вытворчай практыкі і летніх канікулаў...».



Рэпартаж з адкрыцця метро ў Мінску.

## БОЛЕВАЯ КРОПКА

29 снежня 1979 года «Звязда» суха паведаміла: «Урад Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан, прымаючы пад увагу няспыннае і мацнеючае ўмяшанне і правакацыі знешніх ворагаў Афганістана і з мэтай абароны заваёў красавіцкай рэвалюцыі, тэрытарыяльнай цэласнасці, нацыянальнай незалежнасці і падтрымкі міру і бяспекі, грунтуючыся на Дагаворы аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве ад 5 снежня 1978 г., звярнуўся да СССР з настойлівай просьбай аб аказанні тэрміновай палітычнай, маральнай, эканамічнай дапамогі, уключаючы ваенную дапамогу, аб якой урад ДРА раней неаднаразова звяртаўся да ўрада Савецкага Саюза. Урад Савецкага Саюза задаволіў просьбу афганскага боку». За гэтымі радкамі стаіць пачатак 10-гадовага ўмяшальніцтва СССР у грамадзянскую вайну ў Афганістане...

У першыя некалькі гадоў афганскія падзеі асвятляліся хоць і рэгулярна, але дазіравана і відавочна цэнзуравана — зазвычай гэта былі некалькі радкоў пра Кабул у міжнародным аглядзе альбо афіцыйныя справаздачы з чарговых перамоў кіраўніцтва дзвюх краін. «Працягваюцца паспяховыя аперацыі па ліквідацыі контррэвалюцыйных банд у розных правінцыях Афганістана. У бандытаў адабрана зброя амерыканскай і кітайскай вытворчасці, боепрыпасы, падрыўная літаратура, надрукаваная за мяжой», — інфармуе газета ў 1980-м. «Што датычыць абмежаванага савецкага воінскага кантынгента, які знаходзіцца на тэрыторыі ДРА па просьбе афганскага ўрада ў адпаведнасці з Савецка-афганскім дагаворам 1978 г. і Статутам ААН, то пытанне аб тэрмінах яго вываду можа быць разгледжана ў кантэксце палітычнага ўрэгулявання і не раней, чым будзе поўнасцю спынена агрэсія супраць ДРА», — перадрукоўвае «Звязда» крыху пазней афіцыйныя заявы ТАСС. «Савецкі Саюз да канца выканае свой інтэрнацыянальны абавязак па абароне Афганістана ад іншаземнай ваеннай інтэрвенцыі», — зноў жа з заявы ТАСС, але ўжо 1983 года. І толькі ў 1986-м пад эпізадычнай рубрыкай «Месца службы — Афганістан» змешчаны ўспаміны самых вайскоўцаў, у прыватнасці, лейтэнанта Аляксея Астапенкі, пра некаторыя моманты службы: «як стралялі прамой наводкай па душманах, якія спрабавалі непрыкметна пераправіцца цераз раку і ўдарыць па батарэі з тылу; як выручылі агнём афганскіх пехацінцаў, што трапілі пад душманскія кулямёты, як дапамагалі дэхканам бліжэйшага кішлака ў будаўніцтве школы...»



19 ліпеня 1980 года ў Мінск прыбыў Алімпійскі агонь, які з эстафетай спартсменаў рушыў да стадыёна «Дынама», дзе трохразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў Аляксандр МЯДЗВЕДЗЬ і запаліў сімфалічны факел.

Таксама ў кастрычніку 1986-га былі надрукаваны зварот ЦК КПСС «Воінам-інтэрнацыяналістам, якія вяртаюцца з Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан»: «Штодзённа рызыкуючы жыццём, вы, байцы-інтэрнацыяналісты, выратавалі тысячы афганскіх дзяцей, старых і жанчын ад крывавай расправы наёмных забойцаў і тэрарыстаў, далі магчымасць дзецям хадзіць у школу, сялянам збіраць ураджай, рабочым працаваць ля станка. Гэты подзвіг назаўсёды застанецца сімвалам савецка-афганскай дружбы... Савецкія людзі схіляюць галаву перад памяццю загінулых у баях мужных сыноў нашай Радзімы, смуткуюць разам з іх блізкімі, роднымі, сябрамі. Акружыць іх сем'і ўвагай і клопатамі, зменшыць для іх боль і горыч страты — абавязак кожнай партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай арганізацыі, Саветаў народных дэпутатаў». Да пачатку арганізаванага вываду савецкіх войскаў з Афганістана застаецца яшчэ 1,5 года.



Першамайскае свята 1986-га ў Мінску. Абсалютная большасць беларусаў яшчэ нічога не ведае пра аварыю на ЧАЭС...

## ЧОРНАЕ РЭХА

27 красавіка 1986 года, нядзеля. У нумары «Звязды» — вялікі фотарэпартаж з «Гомсельмаша», міжнародны тэлетайп навін з Нью-Ёрка, Гаваны, Багаты, Манагуа, Буэнас-Айрэса; праблемны круглы стол з Дзяржаграпрамам БССР, агляд пошты, спартыўных і культурных падзей. Ані слова пра Чарнобыльскую АЭС. Як, зрэшты, і ў наступным нумары, і ў чарговым. Толькі ў святочным першамайскім выпуску знаходзім кароткае паведамленне ад Саўміна СССР: «Як паведамлялася ўжо ў друку (?), на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, размешчанай за 130 кіламетраў на поўнач ад Кіева, адбылася аварыя. На месцы працуе ўрадавая камісія пад кіраўніцтвам намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР т. Шчарбіны Б. Е. ...Паводле папярэдніх даных, аварыя адбылася ў адным з памяшканняў 4-га энергаблока і прывяла да разбурэння часткі будаўнічых канструкцый будынка рэактара, яго пашкоджання і некаторай уцечкі радыеактыўных рэчываў. Тры астатнія энергаблокі спынены, спраўныя і знаходзяцца ў эксплуатацыйным рэзерве. Пры аварыі загінулі два чалавекі». Паводле гэтай інфармацыі, першапачаткова былі шпіталізаваны 197 чалавек, з якіх 49 пакінулі бальніцы пасля абследавання, пры тым «работа прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і ўстаноў ідзе нармальна». І толькі з 4 мая, калі савецкая краіна адгуляла першамайскія дэманстрацыі, а ігнараваць хваляванне і нападкі замежнай прэсы стала немагчыма, ТАСС пачаў рабіць штодзённыя справаздачы аб ходзе работ «па ліквідацыі аварыі і яе вынікаў» і эвакуацыі людзей з 30-кіламетровай зоны АЭС, а таксама агрызаца ў бок ЗША: «Высокапастаўленыя асобы ў Вашынгтоне выкарыстоўваюць першую ў гісторыі савецкай ядзернай энергетыкі аварыю для палітычнага шантажу СССР, імкнуцца раздуць з яе палітычную праблему ў міжнародных адносінах, прычым у Вашынгтоне праяўляюць дзіўную забыўчывасць, быццам бы ў ЗША нічога падобнага не здаралася» («Звязда», 5 мая).



1978-ы. Рэпартаж з маштабных вучэнняў «Бярэзіна».

З іншага боку, усякае садзейнічанне і дапамогу краіна прымае з удзячнасцю. «У Савецкі Саюз для кансультацый ужо прыбыў вядомы амерыканскі спецыяліст па радыялогіі доктар Р. Гейл. У Маскву па запрашэнні Савецкага ўрада прыязджае генеральны дырэктар Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Х. Блікс», — піша «Звязда». А пакуль партыйныя кіраўнікі, дыпламаты МЗС і навукоўцы спрабавалі адэкватна ацаніць наступствы і маштабы аварыі, журналісты таксама не заставаліся ўбаку. Ужо з 5—6 мая карэспандэнты «Звязды» Уладзімір Пернікаў, Анатоль Мясніковіч і Мікалай Амельчанка ці не кожныя некалькі дзён выязджаюць у камандзіроўкі ў прылеглыя да ЧАЭС раёны — Хойнікі, Брагін, Нароўля. Яны шукаюць — і, што адметна, знаходзяць — для сваіх рэпартажаў пазітыўныя моманты: як простыя вяскоўцы і кіраўнікі гаспадарак дапамагаюць вымушаным перасяленцам на новых месцах, жанчын з малымі дзецьмі адпраўляюць у санаторыі, а школьнікаў — у піянерскія лагеры на аздараўленне, як простыя будаўнікі па ўласнай ініцыятыве падаўжаюць працоўны дзень, каб хутчэй здаць у эксплуатацыю жылыя дамы для «чарнобыльцаў», як вайскоўцы праводзяць санітарную апрацоўку тэрыторыі і тэхнікі, а маладыя работнікі ўнівермага «Беларусь» ахвяруюць квартальную прэмію ў памеры 5960 рублёў у фонд дапамогі пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС...

Ужо ўвосень 1986-га гучаць шматлікія заявы пра тое, што небяспека адступіла. У прыватнасці, «Звязда» цытуе інтэрв'ю дырэктара БелНДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Ігара Жакава: «Абстаноўка на ЧАЭС і вакол яе стабілізуецца з кожным днём, надышоў завяршальны перыяд работ. Сёння рэактар выдзяляе радыеактыўных рэчываў менш, чым звычайная атамная станцыя. Паветра над ім чыстае. ...Намі было ўстаноўлена, што доза абпраменьвання дзяцей горада Хойнікі ізатопамі, якія трапілі ў арганізм, не перавышае 0,1 бэра. Гэта значыць, яна ў 6—7 разоў меншая, чым доза пры флюараграфіі грудной клеткі». Аб тым, што сітуацыя стабілізуецца, паўтараюць на прэс-канферэнцыях і прадстаўнікі МЗС Савецкага Саюза, хоць на той час памерлых ад прамянёвай хваробы супрацоўнікаў АЭС і ратавальнікаў налічвалася ўжо больш як 20...

Натуральна, праз тры з лішнім дзесяцігоддзі, ведаючы, што нічога добра не скончылася, лёгка крытыкаваць папярэднікаў. Але мы гэтага рабіць не будзем — лепш пагартаем далей старыя падшыўкі і паглядзім, як змяніўся настрой і тэматыка публікацый у 90-я.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 29 ліпеня.)*

ПРАКАВЕТНАЕ

# ДЗЕВЯЦЬ КВЕТАК І КРЫНІЧНАЯ ВАДА



**Крыніца святога Яна знаходзіцца ў Глыбоцкім раёне, каля вёскі Бабруйшчына, б'е з-пад гары, на якой стаіць праваслаўная царква. У дзень Іаана Хрысціцеля з самага ранку да крыніцы збіраюцца жыхары навакольных вёсак на малебен і асвячэнне вады. Калісьці тут ладзіліся фэсты і вялікія кірмашы, якія, на жаль, адышлі ў нябыт. У параўнанні са старымі часамі сучасныя фэсты ўжо не такія шматлюдныя і гаманкія. І ўсё ж такі і яны па-свойму асаблівыя, напоўненыя душэўным спакоем, з адгалоскамі самабытнай мінуўшчыны.**

Сёлета мне пашчасціла апынуцца каля славутага струменьчыка і паглядзець на мясцовы, па-ранейшаму прыгожы звычай. А ён пачынаецца з таго, што паломнікі прыходзяць сюды з букецікамі лясных альбо палявых красак. Здаўна павялося, што культавую фларыстычную кампазіцыю павінны складаць сама мала дзевяць кветак. Не толькі жанчыны і дзеці збіраюць і нясуць сюды кветкі — і ў руках мужчын таксама я ўбачыў гэты абавязковы атрыбут свята. Адзін са старэйшых удзельнікаў сёлетняга прыкрынічнага набажэнства, жыхар вёскі Свіла 2 Раман Козел, акрамя півоняў, якія прывёз з дому, дабавіў да букета і лугавых купальскіх кветак. Раман Іванавіч шчыра падзяліўся сваімі пачуццямі. Вёска, дзе ён жыве, знаходзіцца за дванаццаць кіламетраў ад Бабруйшчыны, але пакуль здароўе дазваляе, заўсёды імкнецца пабыць каля крыніцы, адчуць атмасферу свята. Дзякуючы свайму суседу-аўтааматару ён своечасова прыехаў на фэст, пабыў у царкве на набажэнстве, прайшоўся хросным шэсцем, акрапіўся свянцонай вадой. Як вы думаеце, які ў Рамана Іванавіча ўзрост? Не паверыце — восемдзесят сем гадоў!..

Для многіх маладых удзельнікаў, і асабліва для нетутэйшых, удзел у свяце заключаецца толькі ў тым, каб асвяціць кветкі і набраць крынічнай вады. А старэйшыя людзі, як Раман Козел, заўсёды нетаропка размаўляюць з землякамі, уважліва слухаюць казанні цяперашняга настаяцеля айца Вячаслава Пяшко, абавязкова заходзяць у маленькую каплічку і ставяць свечкі перад абразамі і, вядома, схіляюцца перад фігурай святога Іаана.





Цагляную царкву на гары, як аброк Богу, узвёў пан Буйніцкі. Сваім аброкам гаротны пан хацеў дапамагчы дачцэ, якая хварэла і памерла ад сухотаў. Вядомы і час пабудовы храма — 1873 год, і пазнейшая яго гісторыя. Калі ў 1939 годзе на гэтую тэрыторыю прыйшлі Саветы, царкву закрылі. Пасля вайны ў храме была турма. А драўляную скульптуру святога Іаана змагары з рэлігіяй намагаліся ўтапіць у Ксяндзовым возеры (у яго ўпадае крыніца). Але марна! Дзякуючы мужным дзеянням мясцовых жанчын святыня была надзейна схавана і не пацярпела. Калі цемрашальскі час мінуў, фігуру зноў паставілі ў капліцы над крыніцай. У дзевяностых гадах мінулага стагоддзя стараннямі мясцовых жыхароў і святара аднавілі і царкву.

Кажуць, тутэйшая крынічная вада дапамагае ад ста хвароб. Сваю святую ваду бабруйшчынская крыніца шчодра аддае тутэйшым азёрам — а іх тут пяць — і поіць рэчку з прыгожай назвай Шоша.

**Анатоль КЛЯШЧУК**, *anatol@zviazda.by*

**Фота аўтара.**

*Усе здымкі гэтага фотарэпартажу глядзіце на сайце zviazda.by*

Пантэон Айчыны

# ВІТАЎТ (1350—1430)



**Хочацца абстрагавацца ад тых гучных эпітэтаў, якімі надзялілі яго сучаснікі і наступнікі: вялікі, слаўны, гераічны і г. д., і больш аб'ектыўна зірнуць на гэтую ўсё ж вялікую, але ж і драматычную постаць беларускай гісторыі. Культ Вітаўта пачаў складацца ўжо пры яго жыцці, што яскрава праявілася ў летапіснай «Пахвале Вітаўту», а пасля развіўся ў XVI стагоддзі, у часы павольнага занепаду ВКЛ. Вітаўт зрабіўся сімвалам велічы Літвы, дзяржаўнай магутнасці Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Сапраўды пры Вітаўце ВКЛ было самай моцнай дзяржавай ва Усходняй Еўропе. Яе межы сягалі ад Падляшша да ракі Угры, ад Балтыйскага да Чорнага мораў — адна з найбуйнейшых тагачасных еўрапейскіх дзяржаў. У залежнасці ад Вітаўта знаходзіліся татарскія ханы і рускія князі. Усё гэта ўражвае і напаўняе гонарам сэрцы патрыётаў, як у сучаснай Летуве (дзе Вітаўт з'яўляецца нацыянальным героем), гэтак і ў Беларусі (дзе ён знаходзіцца на правах пасынка). Ёсць чым ганарыцца і адначасова няма чым ганарыцца. Дзяржаўная магутнасць — гэта плён дзейнасці Вітаўтавых папярэднікаў, перш за ўсё Альгерда. А пашырэнне меж дзяржавы да Чорнага мора — непатрэбная справа, якая каштавала ВКЛ дарэмных ахвяр. Далучаны і без Вітаўта Смаленск быў пад уладай ВКЛ. Далучэнне адсталай і спустошанай крыжакамі Жамойці мела б тады важнае значэнне, калі б там узніклі партовыя гарады, што звязала б ВКЛ напрасткі па моры з Еўропай і перакрыла б Рыжскі гандаль. Вітаўт гэтага не разумеў і не зрабіў, як і яго наступнікі. Зрэшты, авантура з былым ханам Залатой Арды Тахтамышам і прайграная 12 верасня 1399 года бітва на Ворскле дорага каштавалі ВКЛ, прынамсі, страты часткі свайго суверэнітэту паводле Віленска-Радамскай уніі. І што мы бачым, дзе веліч Вітаўта? За што яго назвалі Вялікім?**

Так, у славутай Грундвальдскай бітве Вітаўт праявіў асабістую мужнасць, узяў, па сутнасці, на сябе кіраванне саюзным войскам, але перамога над крыжакамі не была цалкам яго заслугай. Ды і вынікі гэтай перамогі аказаліся не такімі значнымі. Вітаўт не змог завалодаць найважнейшым портам на Балтыцы Кралеўцам, што сапраўды прынесла б эканамічную і стратэгічную карысць ВКЛ. І галоўнае — гэтак і не зрабіўся ён каралём і не ператварыў сваю дзяржаву ў каралеўства, даўшы ёй гістарычны шанц жыць самастойным дзяржаўным жыццём, стаць паўнапраўным суб'ектам еўрапейскай палітыкі. Шанц, які ўпусціў Вітаўт. Немалая віна Вітаўта ў міжусобных войнах з Ягайлам, калі ён, па словах рускага летапісца, «шмат зла зрабіў зямлі Літоўскай».



Магчыма, я даволі суровы да постаці Вітаўта, наўмысна не бачу таго станоўчага, што зрабіў ён, не ўлічваю яго магчымасці і цяжкасці, якія ён вымушаны быў пераадольваць. Усё гэта я бачу і ўлічваю, але мяркую, як на вышэйшым судзе, па самым высокім рахунку, так бы мовіць, па-гамбургску. Калі табе дадзена вялікая ўлада, дык і справы твае павінны быць вялікія на вякі, дзеля наступных пакаленняў. На жаль, пры ўсім жаданні, такіх вялікіх спраў у Вітаўта няма; значныя, неабходныя, патрэбныя ёсць, а вялікіх... Можа я памыляюся?

Паўстанне Вітаўта ў 1389 годзе супраць Ягайлы ў некаторай меры астудзіла польскія імпэты «прыватызаваць» ВКЛ. Але яшчэ раней, у 1387 годзе, паўстаў Андрэй Полацкі, паўстанне якога падаўляў Вітаўт разам са Скіргайлам.

Стаўшы вялікім князем літоўскім, Вітаўт здолеў зрабіць тое, што не змаглі зрабіць еўрапейскія манархі — правесці цэнтралізацыю дзяржавы, ліквідуючы ўдзельныя княствы. На месцы ўдзельных князёў ён прызначыў сваіх намеснікаў, пераважна з літвінаў, якія праводзілі агульнадзяржаўную палітыку, ахвяраваўшы дзеля яе мясцовымі інтарэсамі. Такім чынам, Вітаўт выкарыстоўваў сілы ўсіх зямель, што ўваходзілі ў ВКЛ, толькі па-разумнаму не змог іх выкарыстаць. Паражэнне на Ворскле прымусіла ісці на ўступкі Ягайлу, які пад ціскам палякаў дамогся ад яго пацвярджэння Крэўскай уніі. Не падначаліў Вітаўт сваёй уладзе Пскоў і Ноўгарад Вялікі, хоць і ваяваў з імі. Сілы разыходзіліся на такія вось няўдалыя войны, а не на ажыццяўленне нейкай адной значнай задачы. Нават далучэнне да ВКЛ Жамойці толькі дадало клопатаў і праблем. Давялося Вітаўту ў 1413 годзе гвалтам насаджаць там каталіцтва, дадаўшы да сваёй сумнай славы «крывапіўца» сярод жамойтаў за падаўленне іх паўстання ў 1405 годзе, славу знішчальніка іх веры. З-за Жамойці Вітаўт загразнуў у доўгіх спрэчках з Ордэнам, якія, па сутнасці, нейтралізавалі ажыццяўленне яго даўняй мары — зрабіцца каралём. Ён губляў дарагі час на доказы прыналежнасці Жамойці да ВКЛ. Як тут не нагадаць Міндоўга ці таго ж Ягайлу, якія дзеля сваіх палітычных мэт лёгка аддавалі Жамойць Ордэну. Пэўна, Вітаўт меў да Жамойці, як матчынай радзімы, сентыментальныя пачуцці і не хацеў гандляваць ёй, тым больш па маці Біруце ён быў жамойтам.

І толькі тады, калі старасць па-здрадніцку падкралася да яго, Вітаўт спахапіўся і пачаў дзейсна рыхтаваць глебу для сваёй каранацыі, заручыўшыся падтрымкай імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда І. Але дзеля гэтага трэба было ісці на разрыў з Польшчай, супраць чаго паднялісія палякі і Ягайла. Яны сарвалі каранацыі ў Луцку ў 1429 годзе падчас з'езду Вітаўта і Сігізмунда І, а пасля ўжо ў Вільні ў 1430 годзе імператарскія паслы, якія везлі Вітаўту карону, даведаўшыся аб заставах на польскіх межах, спыніліся ў Франкфурце. Вітаўт так і не дачакаўся каралеўскай кароны. 27 кастрычніка 1430 года ён памёр у сваім Троцкім замку. Ян Длугаш дае Вітаўту пахвальную характарыстыку: «Сярод людзей нашага часу было пашырана меркаванне, што нікога з сучасных правіцеляў нельга параўнаць з Вітаўтам, што ні адзін з іх не пераўзыходзіць яго ні шчодрасцю, ні ўмелымі дзеяннямі. Ён першы славай здзейсненых спраў, якія пракаціліся рэхам сваіх дзеянняў, вынес на свет і асвяціў бедную і няшчасную сваю айчыну, якая пры наступных князях не мела падобнай велічы». Усё пазнаецца ў параўнанні, і, як бачым, Вітаўт відавочна пераўзыходзіў і тагачасных уладароў, і сваіх наступнікаў, але сярод іх не было сапраўды вялікіх асоб. Ды і хто з іх пражыў такое драматычнае жыццё, як Вітаўт? Ён спазнаў шмат выпрабаванняў лёсу: страту бацькоў, сыноў, якіх атруцілі крыжакі, няволю, ганебныя ўцёкі ад татараў, знявагу ворагаў і сяброў, здраду падданых і шмат чаго іншага. А зрабіўшыся вялікім князем, не траціў час на пацехі, паляванне, гульні, увесь аддаўся дзяржаўным справам. Правіў ён сурова, але справядліва, караў дзяржаўцаў і чыноўнікаў, якія разбагацелі на збіранні падаткаў і рабаванні, што падабалася народу. Ён не аддзяляўся ад народа і кожны пакрыўджаны мог паскардзіцца свайму гаспадару на крыўдзіцеля. Сапраўдны ўзор клапатлівага гаспадара дзяржавы. Гэткім ён і застаўся ў народнай памяці, а не як «паходня вайны», як называлі яго сучаснікі за шматлікія войны, якія ён вёў. Як чалавек Вітаўт наўрад ці быў шчаслівы; згубіўшы сыноў (адзіная дачка Соф'я была жонкай маскоўскага князя Васіля Дзмітрыевіча), ён пазбавіўся нашчадкаў і спадкаемцаў свайго жыцця, і яму заставалася быць «бацькам дзяржавы». Няздзейсненая мара стаць каралём прыгнятала яго на смяротным ложы, рабіла жыццё бессэнсоўным, ён умаляў Ягайлу дазволіць каранаваць, але дарэмна. І адзіным яго суцяшэннем было разуменне, «што кожны чалавек уваскрэсне пасля смерці і атрымае адпаведную плату за свае справы». Ці намякаў ён на пакаранне Ягайлы, ці спадзяваўся на боскую літасць за свае справы, а вось ад наступных пакаленняў ён сапраўды атрымаў належную плату — удзячную памяць пра сябе і найменне Вялікі.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

## Извещение о проведении 14 августа 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белметалл»

| Предмет торгов №1 |
|---|
